Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навукарыстаныя рукапісы назад адтвараю не вярочаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шыпаралі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капітаралі пасьлядо тэксту 1 р. — к.
За радок капітаралі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчыя на 50 проц. дарожей.
Вышэ тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Бесперапоўн. і чарэзпаперыдныя за дакумэнт . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

Падпіска прымаецца ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
Абвесткі прымаецца канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 129 (2317) Чацьвер, 7-га чэрвеня 1928 г.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

АДОЗВА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ МОПР'у БССР.

Да ўсіх рабочых, сялян, да ўсяе працоўнае інтэлігенцыі, да працоўных усяго сьвету.

Таварышы! Разгул сусьветнага фашызму за апошнія часы ня ведае межаў. Жалезам душыць фашызм сапраўдных абаронцаў і прадстаўнікоў рабочае клясы, іх крывёю залівае ўвесь сьвет. Ахоплены шаленствам і помстаю, фашызм усюды фізычна зьнішчае жывыя сілы рэвалюцыі, ня спыняючыся ні перад якімі зьдзекамі і гвалтаваньнямі.

Тое, што мы наглядаем зараз у фашысцкай Італіі, Польшчы і іншых краінах, нагадвае самыя далёкія і цёмныя часы барбарства. Лепшых людзей нашага часу чорнасарочнікі—фашысты Італіі—сотнямі і тысячамі падвяргаюць такім жорсткім катаваньням, ад якіх яны альбо паміраюць, альбо застаюцца калекамі на ўсё жыцьцё. Лепшыя людзі тысячамі кідаюцца на пажыцьцёвыя зьняволеньні, у каменныя мяшкі, альбо вечную ссылку на дзікія выспы. Зьвярыная дзікасьць італьлянскага фашызму даходзіць да таго, што ўсіх абвінавачаных на міланскім працэсе трымалі ў жалезнай клетцы.

Лепшых барацьбітоў італьлянскае рабочае клясы і рэвалюцыйнага сялянства італьлянскі фашызм намеціў сваімі ахвярамі і паставіў іх пад удары асобага трыбуналу, дзе нават не дапушчалася абарона. Асобы трыбунал, спэцыяльна створаны з самых злосных генэралаў і ахраньнікаў, вынес італьлянскім камуністым жорсткі прысуд—на дзесяткі год турэмнага зьняволеньня. Прысуд над італьлянскімі камуністымі ў Мілане ёсьць нішто іншае, як дзікая расправа, азьвяралай банды чорнасарочнікаў Італіі над лепшымі перадавымі прадстаўнікамі рабочае клясы і сялянства, расправа разьлічаная на тое, што масы рабочых і сялян будуць тэрарызаваны жорсткімі карамі. Але гэтыя кары не запужаюць, не пахістаюць барацьбітоў.

У сваёй бязьлітаснай барацьбе з рабочаю клясаю, сялянствам і прыгнечанымі народамі не адстае таксама і польскі фашызм. У сваім імкненьні падавіць усякі вольны рух у краіне і разьвязаць сабе рукі для падрыхтоўкі вайны супроць нашай савецкай краіны польскі фашызм душыць рэвалюцыйных рабочых і сялян, громіць рабочыя і сялянскія арганізацыі, кідае ў катаржныя турмы тых, хто асьмельваецца выступіць на абарону правоў прыгнечаных.

Не пасьпелі яшчэ замоўкнуць абурэньне і пратэсты ва ўсім сьвеце супроць суда і прыгавару над Беларускай Грамадой, як польскі фашызм усёй сваёй сілай кінуўся на кампартыю Заходняй Беларусі і пасьля камедыі працэсу ў Беластоку кінуў у катаржныя турмы лепшых барацьбітоў за справу рабочых і сялян на дзесяткі гадоў.

Таварышы! Працэсы і прысуды ў Вільні, Беластоку, Мілане—ёсьць звены аднаго і таго-ж ланцугу сусьветнага фашызму, які чыніць суд і расправу над пралетарыятам і сялянствам, каб ізноў паставіць на калені, сагнуць у дугу працоўных усяго сьвету.

Таварышы! Пратэстуйце супроць крывавага фашызму, які крывёю рабочых і сялян заліває ўвесь сьвет.

Ганьба сусьветнай буржуазеі, якая, прыкрываючыся формамі дэмакратыі, адначасна пры дапамозе дзікага фашызму, жалезам і крывёю стараецца ўвекавечыць рабства на ўсёй зямной кулі.

Таварышы! Патрабуйце вызваленьня асуджаных у Мілане, Беластоку і Вільні барацьбітоў, патрабуйце вызваленьня ўсіх палітычных зьняволеных, патрабуйце спыненьня дзікага тэрору.

Няхай ва ўсім сьвеце прагучыць магутны голас пратэсту.

Проч фашысцкі тэрор у Польшчы, Італіі, і ва ўсім сьвеце.

Шлём праклёны катам-фашыстам.

Таварышы! Узмацняйце дапамогу ахвярам фашысцкага тэрору і іх сем'ям.

Уступайце ў МОПР.

Няхай жыве барацьба і перамога рабочых, сялян і прыгнечаных народаў ва ўсім сьвеце.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦК МОПР'у БССР.

Аб выдачы Бэла Куна.

(Ліст з Вэнгрыі).

Арышт тав. Бэла Куна ў Вене і падрыхтоўка да перадачы яго ў рукі вэнгерскіх фашыстаў паставілі ў цэнтры ўсеагульнай увагі пытаньне аб праве прытулку для палітычных эмігрантаў.

Вядомы спэцыяліст па міжнароднаму праву, аўстрыйскі прафэсар Ламаш, сьцьвярджае, што прытулак у другой краіне зьяўляецца правам кожнага палітычнага ўцекача і што тая краіна, у якой ён хаваецца, ня мае ніякага права яго выдаваць. Права прытулку палітычных уцекачоў належыць да ліку страдаўніх народных законаў—на падставе пісанага закону ці звычаю, і яго заўсёды прытрымлівалася значная большасьць краін. Калі паміж дзьвюма дзяржавамі няма дагавору аб выдачы або асобнага закону аб праве прытулку, дык пытаньне аб выдачы палкам залежыць ад волі тэй краіны, у якой хаваецца палітэмігрант. Тут дзейнічае маральны закон на падставе народных звычаяў, які забараняе выдачу.

У Аўстрыі няма пісанага закону аб праве прытулку, але ў справе Бэла Куна маюць моц міжнародныя дагаворы аўстрыйскага ўраду, якія робяць яго выдачу незаконнай. Дагавор паміж аўстрыйскім урадам і вэнгерскім сацыял-дэмакратычным урадам, які стаў ля ўлады ў Вэнгрыі, гарантаваў уцёкачым вэнгерскім народным камісарам права прытулку ў Аўстрыі. Апроч таго, у 1920 г. Аўстрыя ўтварыла дагавор з савецкім урадам, згодна якога вэнгерскім народным камісарам давалася права вольнага жыцьця ў Аўстрыі і высылу ў СССР. На падставе гэтых дагавораў выдача Бэла Куна была немагчымай. Гэта пацьвярджаецца і тым, што патрабаваньне вэнгерскага ўраду аб выдачы ўцекачоў—народных камісараў, а таксама іншых дзеячоў Савецкай Вэнгрыі, якое было прад'яўлена да Аўстрыі ў 1920 г., было адхілена аўстрыйскім вярхоўным судом. Гэтая пастанова вышэйшай судовай інстанцыі, зразумела, мае моц і зараз, пры арышце Бэла Куна. Гэта зусім ясна для кожнага нармальнага чалавека.

Але Аўстрыя ўступіла ў сучасны момант на шлях фашызму. Пасьля крывавага прыдушэньня ліпеўскага паўстаньня венскага пралетарыяту аўстрыйскі ўрад зрабіў круты паварот у права ў сваёй унутранай палітыцы. І ранейшая, зусім ясная немагчымасьць выдачы зараз рантам зрабілася спрэчным пытаньнем.

Аўстрыйскі міністр юстыцыі зрабіў у просе заяву, у якой ён выказвае ніпэўнасьць, ці распаўсюджваецца на Бэла Куна чынналсьць вышэйпамянёных дагавораў, і спрабуе надаць яму характар крымінальнага злачынцы. Вэнгерскі ўрад патрабуе галаву Бэла Куна за расстрэл трох афіцэраў. Бэла Куна фігурыруе ў гэтым новым патрабаваньні аб выдачы як крымінальны злачынца, ня гледзячы на тое, што гэтыя тры афіцэры былі расстраляны за контр-рэвалюцыйную прапаганду і падрыхтоўку контр-рэвалюцыйнага паўстаньня супроць вэнгерскага савецкага ўраду. Аўстрыйскія юрысты стараюцца з усіх сіл, каб падвесьці прававую базу пад лўну незаконную меру, якой бы зьявілася выдача Бэла Куна.

Справа з Бэла Купам лішні раз даводзіць, што юрыдычныя нормы зьяўляюцца толькі ілюзорнымі ў буржуазных краінах. Аўстрыйская «дэмакратыя» гатова зрабіць самае агіднае парушэньне закону, каб толькі выслужыцца перад ангельскім імпэрыялізмам. Яна хоча цаною жыцьця Бэла Куна дамагчыся атрыманьня пазыкі і далучыцца да антысавецкага блёку.

Пагражаючая Бэла Куна выдача мае яшчэ і глыбокае прыцыповае значэньне. Яго выдача наперакор пісаным і ніпісаным законам будзе азначаць поўнае скасаваньне права прытулку для палітычных эмігрантаў.

Зараз, у пэрыяд міжнароднэга абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяў, у пэрыяд усеагульнага наступу буржуазеі супроць пралетарыяту і асабліва супроць рэвалюцыйнага руху, на калісьці сьвяшчэннае права прытулку бязупынна робіцца атакі і замахі. У той-жа Аўстрыі летась было выдана трое вэнгерскіх палітэмігрантаў ураду Хорці: гэта—Міхась Ягода, Адольф Ліх і Бостелан Вінцэ.

Урад Панамы арыштаваў у верасьні 1927 г. італьлянскага палітэмігранта Адзарыё і выдаў яго Італіі.

Высланьне і іншыя прасьледваньні палітэмігрантаў зрабіліся зараз нармальным зьявішчам у шмат краінах. Напрыклад, з Францыі, згодна афіцыйных даных францускага ўраду, з жніўня 1926 г. да сакавіка 1928 г. выслана было 13.200 чал.

Падрыхтоўка да выдачы Бэла Куна, аднаго з вядомых рэвалюцыйных правадыроў, набывае ў гэтых абставінах выключнае значэньне. Выдача яго будзе азначаць, што буржуазея раз назаўсёды скончыла з правам прытулку. Калі чэха-славацкі ўрад меў намер у жніўні 1927 г. выдаць румынскаму ўраду рэвалюцыянэра Алекса Кебляша, узьвялася бура пратэстаў рабочых усяго сьвету. Толькі дзякуючы гэтаму пратэсту ўдалося дамагчыся вызваленьня Кебляша.

Зараз аўстрыйская і вэнгерская ўлада працуе супольна, каб перадаць Бэла Куна на расправу катам. Надумываюцца розныя юрыдычныя хітрасьці, каб ліквідаваць рэшткі права прытулку.

Працоўныя ўсяго сьвету павінны перашкодзіць гэтым намерам буржуазеі.

Лёзунг: Ратуйце Бэла Куна! Ратуйце права прытулку для палітычных эмігрантаў!

Ф. Ракош.

У ПЕКІН УВАЙШЛІ ПАУДНЕУЦЫ.

Ультыматум Нанкіна мукдэнскаму камандаваньню.

ШАНХАЙ, 5-6. Чжан-Цзунчан уцёк у Дайрэн. Вэлінгтон-Ку таксама ўцёк у Цянцзін. Ен-Сі-шан заняў Пекін, дзейнічаючы па інструкцыі нанкінскага ўраду. Ен-Сі-шан упаўнаважан узяць у свае рукі ўладу ў Пекіне. Нанкінскі ўрад пастанавіў дазволіць кіруючым мукдэнскім чыноўнікам браць удзел у «палітычным аднаўленьні».

Далей агенцтва Го-Мінь паведамляе, што, водлуг атрыманых ім вестак, нанкінскі ўрад паслаў Ян-Ю-ціну і Чжан-Сюэ-ляну такія ўмовы, з патрабаваньнем безагаворчна згадзіцца на іх: 1) Чжан-Цзо-лін адсоўваецца ад усякага ўдзелу ў палітычным жыцьці; 2) наступнік Чжан-Цзо-ліна павінен быць шчырым прыхільнікам 3-х прынцыпаў Сун-Ят-сэна; 3) наступнік Чжан-Цзо-ліна павінен падначальвацца загадам нанкінскага ўраду; 4) ва ўсёй Манчжурыі павінен быць узьняты сьцяг нанкінскага ўраду.

Для адказу дадзена некалькі дзён.

Падрабязнасьці выбуху ў поезьдзе Чжан-Цзо-ліна.

ПОЕЗД ЗГАРЭЎ.—ЗРУШЭНЬНЕ МАЗГОЎ У ЧЖАН-ЦЗО-ЛІНА.

ПЕКІН, 5-VI. Японскае тэлеграфнае агенцтва «Тохо» і японскі друк Манчжурыі зьмяшчаюць наступныя падрабязнасьці замаху на поезд Чжан-Цзо-ліна. Выбух здарыўся 4 чэрвеня раніцою за 10 вёрст на поўдзень ад Мукдэну. Чатыры вагоны, у тым ліку і вагон, заняты Чжан-Цзо-ліном, У-Цзюн-Шэнам (губарнатар Хэйлунцзянскае і Мукдэнскае правінцый) і штабам Ань-Го-Дзюна, згарэлі. Вагоны, якія ішлі непасрэдна за цягнікам (у іх знаходзіліся міністры пекінскага ўраду і вышэйшыя чыны штабу), сілаю выбуху былі адкінуты далёка наперад, дзякуючы чаму ўхіліліся ад пажару. Чжан-Цзо-лін атрымаў зрушэньне мазгоў і самлеў. У-Цзюн-Шэн атрымаў цяжкія раны і, водлуг вестак японскіх колаў, памёр.

Згодна оноў японскага друку ў Манчжурыі, паведамленьне аб выбуху выклікала ў Мукдэне перапуд. Водлуг атрыманых з Харбіну вестак, учора ў 11 гадз. вечара спэцыяльным поездам з Харбіну выехалі ў Мукден галоўны начальнік асобнага райёну 3-х усходніх правінцый (ранейшая паласа адчужэньня Усх.-Кіт. чыгункі) Чжан-Хуан-Сян і старшыня праўленьня Усх.-Кіт. чыгункі Лючжун-Хуан.

Пратэст кітайскае грамадзкасьці перад Лігаю Нацый.

ЖЭНЕВА, 4-VI. У радзе Лігі Нацый атрыманы кітайскі пратэст проці ўчынкаў Японіі з патрабаваньнем каб Ліга Нацый умяшалася ў кітайска-японскі канфлікт.

Пратэст заяўлен ад імя аб'яднаньня кітайскіх гандлёвых палат, асацыяцыі кітайскіх банкаў, карпарацыі кітайскіх банкіраў, асацыяцыі кітайскіх газэт, саюзу кітайскіх журналістаў і шанхайскае гандлёвае палаты.

НЯЧУВАНАЕ ЗЬВЕРСТВА.

ЛЁНДАН, 5-VI. З Кантону паведамляюць, што гуандуньскае войска расстраляла 400 камуністаў, захопленых на высьпе Хайнар.

Пасылка новых японскіх атрадаў у Манчжурыю.

ТОКІЁ, 5-6. Як паведамляе «Хоці», з прычыны ненакоўў, створаных замахам на поезд Чжан-Цзо-ліна, японскі ўрад, магчыма, пашле новую партыю войска ў Манчжурыю. Вайсковае міністэрства агаласіла заяву, што Японія не бярэ на сябе ніякае адказнасьці за выбух бомбаў, бо па патрабаваньні Кітаю ахова чыгуначнага вузла была перададзена кітайскай уладзе.

СТАЧКА 50.000 ЯПОНСКІХ МАРАКОЎ.

ТОКІЁ, 5-6. З прычыны адмовы прадпрыемцаў устанавіць цьвёрды мінімум заработку, забаставала 50 тысяч маракоў, якія знаходзяцца на службе ў параходнай кампаніі «Кавасакі», абслугоўваючай 1.300 грузавозаў.

ЧЖАН-ЦЗО-ЛІН ПАМЁР АД РАН?

ТОКІЁ, 5-6. У горадзе распаўсюдзіліся чуткі аб сьмерці Чжан-Цзо-ліна, якая здарылася ад ран, атрыманых ім у часе выбуху ў поезьдзе. Чуткі гэтыя пакуль-што не пацьверджаны ніякімі пэўнымі крыніцамі.

Новыя пляны абкружэньня СССР.

Дэ-Монзі заклікае Эўропу да яднаньня.

БЭРЛІН, 5-6. «Бэрлінэр Бэрзен Кур'ер» зьмяшчае артыкул дэ-Монзі аб міжнародным становішчы і аб ролі СССР. Дэ-Монзі піша: «Эўрапейскія дзяржавы згодны між сабою ў тым, што неабходна перашкодзіць заўчэньню 400 мільённага жыхарства ў Кітаі з 150 мільённым жыхарствам Савецкага Саюзу, каб Далёкі Ўсход не зрабіўся апорным пунктам бальшавізму. Для ажыцьцяўленьня пасьпешнага адпору на Далёкім Усходзе проці Расеі кітайскі селянін больш карысны, чымся ангельскі салдат. Маскоўскі плян грунтуецца на тым, каб зьвязаць Японію з Расеяй, а потым прапанаваць Кітаю і Нямеччыне ўвайсьці ў гэты саюз. Гэты акт ужо ня раз абмяркоўваўся на старонках «Известий» (?), прычым з боку Японіі не было ніякіх адхіленьняў. Штрэзэман які відаць, таксама ведае аб гэтым пляне, хоць застаецца невядомым, як ён адносіцца да яго—становіча, ці адмоўна.

Для Францыі ўзьнікае адгэтуль ранейшае ўсяго задача забясьпечыць саюз з Японіяй і Англіяй, і потым вярнуць Нямеччыне тую ролю ў Заходняй Эўропе, для якое яна прызначана. Нямеччына, якой з боку Заходняе Эўропы чыняцца перашкоды, натуральна, прымушана зварочваць сваю ўвагу на Усход. Галоўныя цяжкасьці ў тым, што бальшавіцкія правадыры прысвойваюць сабе права ўмешвацца ў справы ўсіх іншых народаў і разам з тым рашуча забараняюць іншым народам умешвацца нават у другарадныя пытаньні, якія датычаць СССР. Тая акалічнасьць, што франка-расейскія перамовы яшчэ ня спынены, тлумачыцца толькі тым, што ў Францыі жыве абманная надзея, нібы Расея вернецца да сваіх ранейшых саюзных дачыненьняў. Але недалёка той момант, калі будзе неабходным паставіць прадстаўнікоў савецкага ўраду перад нядвусэнсноую альтэрнатываю. Франка-нямецкае зблізканьне будзе азначаць той момант, калі павінна быць пастаўлена гэтае пытаньне. Захаваньне нармальных адносін між Кітаем і заходнімі дзяржавамі залежыць, раней усяго ад таго, ці ўдасца эўрапейскім дзяржавам дамагчыся яднаньня між сабою».

„НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНА".

ВЯЛІЗАРНАЯ РАБОЧАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЛЯ СЬЦЯНЫ КАМУНАРАЎ.

ПАРЫЖ, 4-6. Традыцыйная маніфэстацыя ля Сьцяны Камунараў у Парыжы вылілася ў вялізарную рабочую дэманстрацыю, праведзеную пад кіраўніцтвам камуністаў пад лёзунгам амністыі палітычным зьняволеным і абароны СССР. У працягу 5 гадзін парыскія рабочыя, арганізаваныя па раёнах, са сьцягамі маршыравалі ўздоўж сьцяны пад выгукі: «Няхай жыве Камуна». «Проч вайсковыя рады». «Вызвалім ахвяры клясавае барацьбы—Кашэна, Марты, Дорыё, Мэнетр'е, Дуўлё».

Прыезд асобных дэлегацый ў Жэневу.

1 чэрвеня ў Жэневу выехаў з Коўні старшыня рады міністраў—Вальдэмарас, якому спадарожнічае толькі адютант, яго паручнік Тышкус.

31 мая выехаў у Жэневу польскі міністр замежных спраў—Залескі: Чэмбэрлен таксама накіраваўся з Лёндану ў Жэневу, прычым па дарозе затрымаецца ў Парыжы, дзе будзе мець гутарку з міністрам замежных спраў Францыі—Брыянам, які быццам у надыходзячай сэсіі Рады Лігі Нацый удзелу браць ня будзе.

Штрэзэман таксама не паедзе ў Жэневу; замест яго на чале нямецкай дэлегацыі выехаў з Бэрліну віцэ-міністр замежных спраў Шубэрт.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Арышт беларускага пасла Цэхановіча.

ВАРШАВА, 5-6. У Наваградку арыштован беларускі дэпутат сойму Цэхановіч, не зважаючы на тое, што Цэхановіч ня быў пазбаўлен дэпутацкае недатычнасьці пастановаю сойму. Ён абвінавачваецца ў грамадаўскай агітацыі.

Прыстасаваньне царскіх законаў да яўрэяў.

На пасяджэньні сойму 31 мая яўрэйскі дэпутат Гартглас зазначыў, што ў Польшчы, пры касаваньні царскіх законаў, паніадаюць заўсёды тыя артыкулы, якія абмяжоўваюць правы яўрэйскага насельніцтва.

Падаўшы некалькі такіх прыкладаў, Гартглас сказаў: «На 10-м годзе існаваньня незалежнае Польшчы і на 7-м годзе пасьля прыняцьця канстытуцыі, паводле якое ўсе грамадзяне Польшчы—роўныя, у 1928 годзе ўлада адмаўляе яўрэйскаму насельніцтву ў розных правах, грунтуючыся на царскіх загадах».

ПАДАРОЖЖА ПОЛЬСКІХ ГЕНЭРАЛАЎ У АНГЛІЮ.

Паводле вестак з польскай прэсы—у хутнім часе з Польшчы мае выехаць у Лёндан вайсковая місія.

На чале гэтае місіі будзе стаяць вядомы польскі генэрал—Сікорскі, які ў канцы 1922 і пачатку 1923 г. быў старшынёю рады міністраў.

ПОЛЬСКАЯ «ЛЁЯЛЬНАСЬЦЬ» ДА БЕЛАРУСАЎ.

13 мая б. г. у Вялейцы адбыўся павятовы зьезд Т-ва Беларускае школы.

Калі на зьезьдзе хацеў выступіць з прывітаньнем старшыня галоўнае управы гэтага т-ва—былы беларускі сэнатар Уласаў, дык прадстаўнік улады забараніў гаварыць Уласаву на той падставе, што ў парадзе дню ня ўнесены „прывітаньні".

Прысутныя на зьезьдзе не маглі абгаварыць дзейнасьць т-ва, бо ўсе дакументы, кнігі і рахункавымі ўключна здабраны ад Вялейскага т-ва і знаходзяцца ў старасты.

Калі на зьезьдзе выступіў беларускі дэпутат сойму Ф. Вальнец, дык прысутны польскі чыноўнік спыніў яго прамову і ня даў яму магчымасьці гаварыць.

СТАЧКІ.

ВАРШАВА, 5-6. У Беластоку пачалася забастоўка тэкстыльшчыкаў. Лік бастуючых дасягае 3 тысяч. Бастуючыя патрабуюць павышэньня заработку на 40 проц.

Забастоўка пашыраецца. Чаяюць таксама забастоўкі на тэкстыльных прадпрыемствах Лодзьдзі.

РАПТОЎНАЯ СЬМЕРЦЬ ПРАВАКАТАРА.

Газэта «Роботнік» (№ 152) паведамляе, быццам у Бельску невядомыя асобы атруцілі нейкага Яна Гурскага, які быў правакатарам і сваю правакатарскую работу вялі ў вядомай Беластоцкай справе 126.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-й гадз. ночы).

Румынская вайсковая дэлегацыя ў Варшаве.

ВАРШАВА, 6-6. Сёньня ў Варшаву прыехала румынская вайсковая дэлегацыя. Газэта „Эпоха" думае, што дэлегацыя сёньня будзе прынята Пілсудзкім.

Чэмбэрлен аб тактыцы Вальдэмараса.

ЖЭНЕВА, 6-6. Учора Чэмбэрлен прыняў прадстаўнікоў ангельскага друку. У гутарцы Чэмберлен заявіў, што рада Лігі Нацый абурана тактыкаю Вальдэмараса, які сабатуе яе пастановы.

Чэмбэрлен кажа, што зазначаў Вальдэмарасу ў Лёндане на яго палітыку, якая зьяўляецца непасрэднаю пагрозаю міру. Аднак, Літва ізноў зрабіла ледзь не правакацыю. Далучаны да літоўскае канстытуцыі артыкул, што Вільня—сталіца Літвы—раўназначны—як-бы Нямеччына заявіла, што Штрасбург яе сталіца.

Ліга Нацый ня можа дапусьціць надалей такое правакацыйнае тактыкі. Польска-літоўскі канфлікт павінен быць канчаткова ліквідаваны.

НАША ПРЭСА І ЛЁЗУНГ САМАКРЫТЫКІ.

(На усесаюзнай агітпропнарадзе).

МАСКВА, 5-6. Адбылася нарада камісіі ўсесаюзнае агітпропнарады па пытаньні аб задачах друку ў зьвязку з лёзунгам самакрытыкі. У нарадзе брала ўдзел каля 50 чал., у тым ліку прадстаўнікі маскоўскіх газэт, працаўнікі ЦКК-РСІ, судовых органаў, пракуратуры і г. д.

Тав. Інгулаў у сваім дакладзе падрахаваў вынікі першага этапу самакрытыкі і намеціў чарговыя задачы друку для далейшага разгортваньня самакрытыкі і ўзмацненьня ў яе шырокіх мас. Тав. Інгулаў адзначыў, што «ліставі РКІ» ужо ёсьць больш, чым у 50 губэрскіх і абласных газэтах.

Аб'ектам абстрэлу зьяўляецца ўжо не адзін «стрэльчык», але і больш буйны працаўнік. Узмацнілася сувязь друку з органамі ЦКК-РСІ і пракуратурай. Моцна ўзрасла ўвага шырокіх мас да друку, павялічылася колькасьць лістоў, якія атрымліваюць газэты. Нажаль, часта асноўнае назначэньне—ушчываньне мас у барацьбу проці адмоўных зьявішчаў у імя станоўчага будаўніцтва—выпушчаецца з пад увагі крытыкі. Апрача таго лёзунг самакрытыкі праводзіцца трохі ўзарным, кампанейскім парадкам.

Патрабаваньне 15-га партыйнага зьезду, каб крытыка праводзілася «не зважаючы на асоб» таксама нездавальняюча праведзена ў жыцьцё. Існуе яшчэ нешта накшталт табелю аб рангах; у губэрскіх газэтах можна крытыкаваць працаўнікоў на вышэй навятовага абхвату, у паветах — ня вышэй валаснога і г. д. Адмоўнаю рысаю зьяўляецца тое, што буйныя зьявішчы, накшталт шахцінскае зьмовы, смаленскае справы і г. д., якія сыгналізуюць аб поўных палітычных небясьпеках, праходзяць без належнае ўвагі друку. З боку партыйных органаў яшчэ адсутнічае патрэбнае падтрыманьне друку, а іншы раз наглядаецца нават проты адпор выкрываючай дзейнасьці мясцовага друку. Галоўнаю умоваю посьпеху самакрытыкі зьяўляецца не дзейчасьць, атрыманьне канкрэтных вынікаў ад крытыкі. Пад правядзеньнем лёзунгу самакрытыкі трэба разумець высокі ўдым актыўнасьці мас і ў тым ліку найбольш адсталых гушчаў рабочых. Крытыка пакуль закранае толькі гаспадарчаў і савецкіх чыноўнікаў; трэба, каб крытыкавалі і недахопы нашых партыйных арганізацый. Нарэшце, патрэбна газэтная самакрытыка.

Па дакладзе разгарнуліся жвавыя спрэчкі. Выступаўшыя галоўным чынам рэдактары мясцовых газэт закранулі такія пытаньні, як нагодзьнае заместак, паняцьцяня праверка, аб'екты крытыкі, адказнасьць рэдактара і г. д.

Тав. Ройзэман прапануе браць прыклад з РСІ.—Хто сапраўды піша і не нагодзьвае—заяўле ён—дык гэта РСІ, маючы дырэктывы ад т. Арджанікідзэ, каб ніякіх пагодзьняў не рабіць.

Тав. Крыленка ў сваім выступленьні падкрэсьліў, што ў друку важней усяго разгарнуць працу на практычным расьсьледаваньні фактаў, якія паведамляюцца ў замотках, і весьці гэтае расьсьледаваньне да канца.

Пасьля заключнага слова т. Інгулава тэзісы аб задачах друку з лёзунгам самакрытыкі былі прыняты за аснову, а для канчатковае рэдакцыі была абрана камісія.

3-га чэрвеня на заключным пасяджэньні ўсесаюзнае агітпропнарады т. Інгулаў зрабіў даклад аб працы камісіі, пасьля чаго тэзісы былі зацьверджаны пленумам агітпропнарады.

ЗЯМЛЯ ФРАНЦА ІОСІФА—САВЕЦКАЯ ТЭРЫТОРЫЯ.

Заявы савецкіх вучоных прадстаўніку ТАСС.

МАСКВА, 5-VI. У зьвязку з весткамі аб тым, што генэрал Нобіле знаходзіцца на т. зв. зямлі Франца-Іосіфа, ТАСС зьвярнуўся да некаторых навуковых дзеячоў Саюзу з просьбаю даць весткі аб становішчы гэтага далёкага архіпэлягу. З усіх водгукаў вучоных відаць, што архіпэлаг гэты зьяўляецца савецкай тэрыторыяй, што ў савецкіх навуковых установах падрыхтоўваецца шэраг мер для заснаваньня там навуковае базы і для арганізацыі кліматычнага вывучэньня гэтага раёну.

ПРАФ. САМАЙЛОВІЧ (дырэктар Ленінградзкага Інстытуту па вывучэньні Поўначы) зазначае, што дырэктар ЦВК СССР ад 15-га красавіка 26 г. канчаткова замацаваўшы зямлю Франца Іосіфа за СССР, яшчэ больш абавязвае нас ня спыняць сыстэматычнае працы ў гэтым раёне.

ВІЗЭ (старэйшы фізык галоўнае геаграфічнае абсэрваторыі) гаворыць: „16-га красавіка 1925 г. ЦВК СССР выдаў пастанову, водлуг якое ўсе землі і выспы на Паўночным Лёдавым акіяне на поўнач ад узьбярэжжа СССР да паўночнага кампасоўся зьяўляюцца тэры орыяй Савецкага Саюзу. Гэтай пастановай зямля Франца-Іосіфа, якая ляжыць на нашым мэрыдыане, абвешчана афіцыйна савецкай тэрыторыяй. Найбольшае падмацаваньне нашым падставам даюць расейскія экспэдыцыі на зямлі Франца-Іосіфа. У 1913-14 г. г. экспэдыцыя, удзельнікам якое я быў, правяла на зямлі Франца-Іосіфа даволі яляную здымкавую працу, зрабіла шмат адрозьніваючых знакаў, выканала вялікія геалёгічныя і мэтэорологічныя даследаваньні архіпэлягу. У 1914 г. архіпэлаг наведала экспэдыцыя Брусілава, якая была зацісьнута ў лёдзе.

Як паведамляюць ТАСС'у з поўных крыніц пастанова ЦВК СССР ад 15-га красавіка 1926 г. аб тэрытарыяльнай прыналежнасьці палярных абласьцёў была ў свой час паведамлена Наркаматам Замежных Спраў урадам дзяржаў, з якімі СССР знаходзіцца ў дыпляматычных дачыненьнях.

Аб выдачы Бэла Куна.

(Ліст з Вэнгрыі).

Арышт тав. Бэла Куна ў Вене і падрыхтоўка да перадачы яго ў рукі вэнгерскіх фашыстаў паставілі ў цэнтры ўсеагульнай увагі пытаньне аб праве прытулку для палітычных эмігрантаў.

Вядомы спэцыяліст па міжнароднаму праву, аўстрыйскі прафэсар Ламаш, сьцьвярджае, што прытулак у другой краіне зьяўляецца правам кожнага палітычнага ўцекача і што тая краіна, у якой ён хаваецца, ня мае ніякага права яго выдаваць. Права прытулку палітычных уцекачоў належыць да ліку страдаўніх народных законаў—на падставе пісанага закону ці звычаю, і яго заўсёды прытрымлівалася значная большасьць краін. Калі паміж дзьвюма дзяржавамі няма дагавору аб выдачы або асобнага закону аб праве прытулку, дык пытаньне аб выдачы палкам залежыць ад волі тэй краіны, у якой хаваецца палітэмігрант. Тут дзейнічае маральны закон на падставе народных звычаяў, які забараняе выдачу.

У Аўстрыі няма пісанага закону аб праве прытулку, але ў справе Бэла Куна маюць моц міжнародныя дагаворы аўстрыйскага ўраду, якія робяць яго выдачу незаконнай. Дагавор паміж аўстрыйскім урадам і вэнгерскім сацыял-дэмакратычным урадам, які стаў ля ўлады ў Вэнгрыі, гарантаваў уцёкачым вэнгерскім народным камісарам права прытулку ў Аўстрыі. Апроч таго, у 1920 г. Аўстрыя ўтварыла дагавор з савецкім урадам, згодна якога вэнгерскім народным камісарам давалася права вольнага жыцьця ў Аўстрыі і высылу ў СССР. На падставе гэтых дагавораў выдача Бэла Куна была немагчымай. Гэта пацьвярджаецца і тым, што патрабаваньне вэнгерскага ўраду аб выдачы ўцекачоў—народных камісараў, а таксама іншых дзеячоў Савецкай Вэнгрыі, якое было прад'яўлена да Аўстрыі ў 1920 г., было адхілена аўстрыйскім вярхоўным судом. Гэтая пастанова вышэйшай судовай інстанцыі, зразумела, мае моц і зараз, пры арышце Бэла Куна. Гэта зусім ясна для кожнага нармальнага чалавека.

Але Аўстрыя ўступіла ў сучасны момант на шлях фашызму. Пасьля крывавага прыдушэньня ліпеўскага паўстаньня венскага пралетарыяту аўстрыйскі ўрад зрабіў круты паварот у права ў сваёй унутранай палітыцы. І ранейшая, зусім ясная немагчымасьць выдачы зараз рантам зрабілася спрэчным пытаньнем.

Аўстрыйскі міністр юстыцыі зрабіў у просе заяву, у якой ён выказвае ніпэўнасьць, ці распаўсюджваецца на Бэла Куна чынналсьць вышэйпамянёных дагавораў, і спрабуе надаць яму характар крымінальнага злачынцы. Вэнгерскі ўрад патрабуе галаву Бэла Куна за расстрэл трох афіцэраў. Бэла Куна фігурыруе ў гэтым новым патрабаваньні аб выдачы як крымінальны злачынца, ня гледзячы на тое, што гэтыя тры афіцэры былі расстраляны за контр-рэвалюцыйную прапаганду і падрыхтоўку контр-рэвалюцыйнага паўстаньня супроць вэнгерскага савецкага ўраду. Аўстрыйскія юрысты стараюцца з усіх сіл, каб падвесьці прававую базу пад лўну незаконную меру, якой бы зьявілася выдача Бэла Куна.

Справа з Бэла Купам лішні раз даводзіць, што юрыдычныя нормы зьяўляюцца толькі ілюзорнымі ў буржуазных краінах. Аўстрыйская «дэмакратыя» гатова зрабіць самае агіднае парушэньне закону, каб толькі выслужыцца перад ангельскім імпэрыялізмам. Яна хоча цаною жыцьця Бэла Куна дамагчыся атрыманьня пазыкі і далучыцца да антысавецкага блёку.

Пагражаючая Бэла Куна выдача мае яшчэ і глыбокае прыцыповае значэньне. Яго выдача наперакор пісаным і ніпісаным законам будзе азнача

НА ХЛЕБНЫМ ФРОНЦЕ.

(З гутаркі т. Сталіна са студэнтамі Ін-ту Чырвонай прафэсуры, Камун. акадэміі і Сьвярдлоўскага унівэрсытэту).

Запытаньне. Што належыць лічыць асноўным у нашых цяжкасьцях па хлебнай справе? У чым выхад з гэтых цяжкасьцяў? Якія павінны быць вывады ў зьвязку з цяжкасьцямі ў адносіне тэмпу разьвіцьця нашай індустрыі наогул, асабліва з пункту гледжаньня суадносін між лёгкаю і цяжкаю індустрыяй?

Адказ. З першага погляду можа здавацца, што нашы хлебныя цяжкасьці вяўляюцца выпадковымі, вынікам толькі дрэннага плянаваньня, вынікам толькі шэрагу памылак у справе гаспадарчага збалянсаваньня. Але гэта можа здавацца толькі з першага погляду. На справе, прычыны цяжкасьцяў значна глыбей. Што дрэннае плянаваньне і памылкі па гаспадарчаму збалянсаваньню адыгралі тут значную ролю,—гэта факт. Але тлумачыць усё дрэнным плянаваньнем і выпадковымі памылкамі,—значыцца ўпадаць у грубейшую памылку. Было-б памылковым зьмяншаць ролю і значэньне плянаваньня. Але было-б яшчэ большай памылкай перайвялічваць ролю плянавага пачатку, думаючы, што мы ўжо дасягнулі тэй ступені разьвіцьця, калі маецца магчымасьць плянаваць і рэгуляваць усё і ўсіх. Ня трэба забываць, што апроч элемэнтаў, якія падпадаюць нашаму плянаваму ўплыву, у складзе нашай народнай гаспадаркі маюцца яшчэ іншыя элемэнты, якія пакуль што яшчэ не падпадаюць плянаваньню, маюцца, нарэшце, варожыя нам клясы, якіх нельга перамагчы ў парадку простага дзяржплянаўскага плянаваньня. Вось чаму я думаю, што нельга ўсё тлумачыць простай выпадковасьцю, памылкай плянаваньня і г. д.

Але ў чым-жа аснова нашых цяжкасьцяў на хлебным фронце?

Аснова нашых хлебных цяжкасьцяў зьяўляецца ў тым, што рост вытворчасьці таварнага хлеба ідзе ў нас больш марудна, як рост спажываньня хлеба. Расьце прамысловасьць. Расьце колькасьць рабочых. Растуць гарады. Растуць, нарэшце, райёны выпрацоўкі тэхнічнай сыравіны (бавоўна, лён, буракі і г. д.), якія прад'яўляюць попыт на таварны хлеб. Усё гэта дае шпаркі рост спажываньня таварнага хлеба. А выпрацоўка таварнага хлеба расьце вельмі марудным тэмпам. Нельга сказаць, што загатоўленага хлеба, які ўжо маецца ў дзяржавы, было ў нас сёлета менш, як у леташнім і залетаршнім годзе. Наадварот, сёлета ў нас мелася ў руках дзяржавы значна больш хлеба, чымся ў мінулыя гады. І ўсё-ж у нас ёсьць цяжкасьці на хлебным фронце. Вось некаторыя лічбы. У 1925-26 г. мы змаглі загатовіць на 1 красавіка 434 млн. пуд. хлеба. З іх вывезьлі заграніцу 123 млн. пуд. Заставалася, такім чынам, у краі загатоўленага хлеба 311 млн. пуд. У 1926-27 г. мы мелі на 1 красавіка загатоўленага хлеба 596 млн. пуд. З іх вывезьлі заграніцу 153 млн. пуд. Заставалася ў краіне загатоўленага хлеба 443 млн. пуд. У 1927-28 г. мы мелі на 1 красавіка загатоўленага хлеба 576 млн. пуд. З іх вывезьлі заграніцу 27 млн. пуд. Заставалася ў краіне загатоўленага хлеба 549 млн. пуд. Інакш кажучы, мы мелі сёлета на 1 красавіка загатоўленага хлеба для патрэб краіны на 100 млн. пуд. больш чымся ў леташнім годзе, і на 230 млн. пуд. больш, чымся ў пазалетаршнім годзе. Адна мы маем сёлета цяжкасьці на хлебным фронце.

Я ўжо казаў у адным з сваіх дакладаў, што гэтыя цяжкасьці былі скарыстаны капіталістычнымі элемэнтамі вёскі і, перш за ўсё, „кулакам",—для таго, каб сарваць савецкую гаспадарчую палітыку. Вы ведаеце, што савецкая ўлада ўжыла шэраг мер, якія мелі сваёй мэтай ліквідаваць антысавецкае выступленьне кулацтва. Я ня буду, нагэтаму, спыняцца больш падрабязна на гэтым. Мяне цікавіць у гэтым выпадку іншае пытаньне. Я маю на ўвазе пытаньне аб прычынах маруднага росту выпрацоўкі таварнага хлеба, пытаньне аб тым, што рост выпрацоўкі таварнага хлеба ідзе ў нас больш марудна, чымся рост спажываньня хлеба, ня гледзячы на тое, што мы ўжо дасягнулі даваенных норм засеўных плошчаў і валавай прадукцыі хлеба.

Хіба-ж гэта ня факт, што мы ўжо дасягнулі даваенных норм засеўных плошчаў? Факт. Хіба-ж гэта ня факт, што валавая прадукцыя хлеба ўжо ў мінулым годзе дасягнула даваеннай нормы вытворчасьці, г. зн. даходзіла да 5 млрд. пуд. хлеба? Факт. Чым-жа тлумачыцца ў такім разе, што, ня гледзячы на гэта, мы выпрацоўваем таварнага хлеба ў два разы менш, а вывозім заграніцу хлеба разоў у дваццаць менш, чым у даваенны час? Тлумачыцца гэта перш за ўсё і галоўным чынам заменаю пабудовы нашай сельскай гаспадаркі ў выніку Кастрычнікавай рэвалюцыі, пераходам ад буйнай абшарніцкай і буйнай кулацкай гаспадаркі, якая давала найбольшую колькасьць таварнага хлеба, да дробнай і сярэдняй сялянскай гаспадаркі, якая дае найменшую колькасьць таварнага хлеба. Ужо адно тое, што да вайны мы мелі 15-16 млн. індывідуальных сялянскіх гаспадарак, а зараз мы маем 24-25 млн. сялянскіх гаспадарак,—ужо адно гэта гаворыць за тое, што асноўнай базай нашай сельскай гаспадаркі зьяўляецца дробная сялянская гаспадарка, якая дае мінімум таварнага хлеба. Сіла буйнай гаспадаркі ў земляробстве, ці зьяўляецца яна абшарніцкай, кулацкай ці калектыўнай гаспадаркай,—у тым, што яна, гэта буйная гаспадарка, мае магчымасьць ужываць машыны, скарыстаць даныя навукі, ужываць угнаеньні, уздымаць прадукцыйнасьць працы і даваць, такім чынам, найбольшую колькасьць таварнага хлеба. І наадварот, слабасьць дробнай сялянскай гаспадаркі зьяўляецца ў тым, што яна пазбаўлена, ці амаль пазбаўлена гэтых магчымасьцяў, а прычыны чаго і зьяўляецца яна гаспадаркай паўспажывецкай, малатаварнай. Узяць, напрыклад, калектыўныя гаспадаркі і савецкія гаспадаркі. Яны даюць у нас таварнага хлеба ў 47,2 проц. усёй сваёй валавай вытворчасьці. Інакш кажучы, яны даюць таварнага хлеба больш, чымся абшарніцкая гаспадарка ў даваенны час. А дробныя і сялянскія гаспадаркі? Яны даюць у нас таварнага хлеба ўсяго толькі ў 11,2 пр. усёй сумы сваёй прадукцыі. Розьніца, як бачыце, досыць красамоўная.

Вось вам некалькі лічбаў, выкрываючых малюнак стану хлебнай вытворчасьці ў мінулым, у даваенны перыяд, і ў сучасны момант, у пасьлякастрычнікавы перыяд. Лічбы гэтыя дадзены членамі калегіі ЦСУ т. Нямчынавым. Яны, гэтыя лічбы, не прэтэндуюць на дакладнасьць, як дадаў у сваёй запісцы тав. Нямчынаў,—яны даюць магчымасьць зрабіць толькі прыблізнае падлічэньне. Але гэтыя лічбы зусім выстарчальныя для таго, каб зразумець розьніцу між пэрыядам даваенным і пэрыядам пасьлякастрычнікавым з пункту гледжаньня пабудовы хлебнай вытворчасьці наогул і асабліва выпрацоўкі таварнага хлеба.

	Валавая прадукцыя хлеба		Таварны хлеб (па-за васковы)		% таварнасьці
	Млн. п.	%	Млн. п.	%	
Даваенны:					
1. Абшарнікі	600	12,0	281,6	21,6	47
2. Кулакі	1900	38,0	650,0	50,0	34
3. Серадн. і бедн.	2500	50,0	369,0	28,4	14,7
Усяго	5000	100	1300,6	100	26
У 1926-1927 годзе:					
1. Савгасы і калгасы	80,0	1,7	37,8	6,0	47,2
2. Кулакі	617,0	13,0	126,0	20,0	20,0
3. Серадн. і бедн.	4052,0	85,3	466,2	74,0	11,2
Усяго	4749,0	100	630,0	100	13,3

Аб чым гаворыць гэта табліца?

Яна гаворыць, папершае, аб тым, што выпрацоўка пераважнай большасьці хлебных прадуктаў перайшла ад абшарнікаў і кулакоў да дробных і сярэдніх сялянскіх гаспадарак. Гэта значыць, што дробныя і сярэднія сялянскія гаспадаркі, якія вызваліліся ад абшарніцкага ўціску і падарвалі ў асноўным сілу кулацтва, атрымалі магчымасьць сур'ёзным чынам палепшыць сваё матар'яльнае становішча. Гэта—вынікі Кастрычнікавай рэвалюцыі. У гэтым, відаць, перш за ўсё тая рашучая карысьць, якую атрымалі асноўныя масы сялянства ад Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Яна гаворыць, папершае, пра тое, што асноўнымі ўласьнікамі таварнага хлеба зьяўляюцца ў нас дробныя, перш за ўсё, сярэднія сялянскія гаспадаркі. Гэта значыць, што ня толькі з пункту гледжаньня валавай прадукцыі хлеба, але і з пункту гледжаньня выпрацоўкі таварнага хлеба СССР зрабіўся, у выніку Кастрычнікавай рэвалюцыі, краінай дробнасялянскае гаспадаркі, а серадняк—„цэнтральнай фігурай" земляробства.

Яна гаворыць, падругое, аб тым, што ліквідацыя абшарніцкай (буйнай) гаспадаркі, скарачэньне кулацкай (буйнай) гаспадаркі больш чым іншая і пераход да дробнай сялянскай гаспадаркі, якое прадстаўляе толькі 11 пр. таварнасьці, пры адсутнасьці колькінебудзь разьвітай буйнай грамадзкай гаспадаркі ў галіне хлебнага засеву (калгасы, савгасы) павінны былі прывесьці і сапраўды прывялі да вострага скарачэньня засеву таварнага хлеба ў параўнаньні з даваенным часам. Гэта факт, што цяпер мы маем таварнага хлеба ў два разы менш, ня гледзячы на даваенную норму валавай прадукцыі хлеба.

Вось дзе аснова нашых цяжкасьцяў на хлебным фронце.

Вось чаму нельга лічыць нашы цяжкасьці ў галіне хлебазагатовак проста выпадковасьцю.

Бязумоўна, што вядомую адмоўную ролю адыграла тут і тое, што нашы гандлёвыя арганізацыі ўзялі на сябе непатрэбны абавязак забясьпечаньня хлебам шэрагу дробных і сярэдніх гарадоў, што не магло зьменшыць хлебных запасаў дзяржавы. Няма ніякіх падстаў сумневацца, што асновай нашых цяжкасьцяў на хлебным фронце зьяўляецца ня гэты факт, а факт павольнага разьвіцьця таварнасьці нашай сельскай гаспадаркі пры ўзмоцненым узросьце патрэбы на таварны хлеб.

Дзе выхад з гэтага становішча?

Ёсьць людзі, якія знаходзяць выхад з гэтага становішча ў звароце да кулацкай гаспадаркі, у разьвіцьці і разгортваньні кулацкай гаспадаркі. Гэтыя людзі не адважваюцца гаварыць аб звароце да абшарніцкай гаспадаркі, мабыць разумеючы, што небясьпечна ў наш час гаварыць аб гэткіх рэчах. Але яны тым больш ахвотна гавораць аб неабходнасьці ўсямернага разьвіцьця кулацкай гаспадаркі ў інтарэсах... савецкай улады. Гэтыя людзі думаюць, што савецкая ўлада магла-б абаперціся адразу на дзьве процілеглыя клясы—на клясу кулакоў, гаспадарчым прынцыпам якіх зьяўляецца эксплёатацыя рабочай клясы і на клясу рабочых, гаспадарчым прынцыпам якіх зьяўляецца зьнішчэньне ўсялякай эксплёатацыі. Фокус, варты рэакцыянэраў. Ня трэба і даказваць, што гэтыя рэакцыённыя „пляны" ня маюць нічога супольнага з інтарэсамі рабочай клясы, з прынцыпамі марксызму, з задачамі ленінізму. Размовы аб тым, што кулак „ня горш" за гарадзкога капіталіста, што кулак ня больш небясьпечны, чым гарадзкі нэпман, што, дзякуючы гэтаму, нам ня трэба зараз «баяцца» кулацтва,—гэткія размовы зьяўляюцца пустой лібральнай балбатнёй, якая ўсыпляе пільнасьць рабочай клясы і асноўных мас сялянства. Ня трэба забывацца, што калі ў індустрыі мы можам процістаўіць дробнаму капіталісту ў горадзе буйную сацыялістычную прамысловасьць, якая дае восем дзесятых усёй масы прамысловых тавараў, дык буйнай кулацкай вытворчасьці ў вёсцы мы можам процістаўіць па лініі вытворчасьці толькі калгасы і савгасы, якія не ўмацаваліся і засяваюць хлеба ў 8 разоў менш, чым кулацкія гаспадаркі. Не разумець значэньня гэтай буйнай кулацкай гаспадаркі ў вёсцы, не разумець, што ўдзельная вага кулацтва ў вёсцы ў сто разоў вышэйшая, чымся ўдзельная вага капіталістаў у гарадзкой прамысловасьці, гэта значыць зварацець, парваць з ленінізмам, перайсьці на бок ворагаў рабочае клясы.

Які-ж выхад з гэтага становішча?

1) Выхад, перш за ўсё, у тым, каб перайсьці ад дробных, адсталых і распыленых сялянскіх гаспадарак да аб'яднаных, буйных, грамадзкіх гаспадарак, забясьпечаных машынамі, узброеных данымі навукі і здольнымі засяваць найбольшую колькасьць таварнага хлеба. Выхад—у пераходзе ад індывідуальнай сялянскай гаспадаркі да калектыўнай, да грамадзкай гаспадаркі ў земляробстве.

Да арганізацыі калгасаў Ленін заклікаў партыю яшчэ з першых дзён Кастрычнікавай рэвалюцыі. З таго часу прапаганда ідэі калгасаў ня спынялася ў нас у партыі. Аднак, заклік да калгасаў знайшоў масавы водгук толькі ў апошні час. Тлумачыцца гэта тым, што шырокае разьвіцьцё каапэрацыйнай грамадзкасьці ў вёсцы падрыхтавала пералом у настроі сялянства на карысьць калгасаў, а наліччa шэрагу калгасаў, якія ўжо зараз даюць 150-200 пуд. ураджаю з дзесяціны і прадстаўляюць 30-40 проц. таварнасьці, стварыла сур'ёзную цягу беднаты і ніжэйшых пластоў сялянства да калгасаў. Не малое значэньне тут мае і тое, што толькі ў апошні час дзяржава мае магчымасьць сур'ёзна фінансаваць калгасны рух. Вядома, што ў гэтым годзе дзяржава асігнавала на дапамогу калгасам у два разы больш, чым у мінулым годзе (больш 60 мільёнаў руб.) 15 зьезд партыі быў зусім праў, прызнаючы, што ўмовы для масавага калгаснага руху ўжо пасьпелі, што ўзмацненьне калгаснага руху зьяўляецца адным з больш сур'ёзных сродкаў для ўзьнімцця таварнасьці хлебнага засеву ў краіне.

Валавая прадукцыя хлеба ў калгасах у 1927 годзе, па даных ЦСУ, складала ня менш 55 мілёнаў пудоў з агульнай сярэдняй таварнасьцю ў 30 проц. Шырокая хваля арганізацыі новых калгасаў і пашырэньне старых у пачатку гэтага году павінны даць значнае павялічэньне засеву ў калгасах да канца году. Задача складаецца з таго, каб захаваць сучасны тэмп разьвіцьця калгаснага руху, узбуйніць калгасы, адкінуць фальшывыя калгасы, замяніўшы іх сапраўднымі калгасамі, і ўстанавіць гэткі рэжым, каб калгасы здавалі дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям увесь свой таварны хлеб пад пагрозай пазбаўленьня субсыдый і крэдытаў з боку дзяржавы. Я думаю, што пры захаваньні гэтых умоў мы маглі-б дамагчыся таго, каб праз 3-4 гады мець ад калгасаў мілёнаў 40-50 пуд. таварнага хлеба.

Іншы раз калгасны рух процістаўіць каапэрацыйнаму руху, мяркуючы, відавочна, што калгасы—адно, а каапэрацыя—другое.

Гэта, зразумела, няправільна. Некаторыя даходзяць нават да таго, што калгасы процістаўіць каапэрацыйнаму пляну Леніна. Няма чаго і гаварыць, што гэткае процістаўленьне ня мае нічога супольнага з сапраўднасьцю. На справе, калгасы ёсьць від каапэрацыі, найбольш яскравы від вытворчай каапэрацыі. Ёсьць каапэрацыя па збыту дастаўцы, ёсьць каапэрацыя і вытворчая. Калгасы яўляюць непрарыўную складаную частку каапэрацыйнага руху наогул, ленінскага каапэрацыйнага пляну—у прыватнасьці. Праводзіць ленінскі каапэрацыйны плян—гэта значыць, уздымаць сялянства ад каапэрацыі па збыту, па дастаўцы, да каапэрацыі вытворчай, да каапэрацыі калгаснай. Гэтым, між іншым, растлумачваецца той факт, што калгасы ў нас пачалі арганізоўвацца і разьвівацца толькі ў выніку разьвіцьця і ўзмацненьня каапэрацыі па збыту і па дастаўцы.

2) Выхад, падругое, у тым, каб пашырыць і ўзмацніць старыя савгасы, арганізаваць і разьвіць новыя буйныя савгасы. Валавая прадукцыя хлеба ў сучасных савгасах складала ў 1927 г., па даных ЦСУ, ня менш 45 мілёнаў пудоў з таварнасьцю ў 65 проц. Бязумоўна, што пры пэўным падтрыманьні з боку дзяржавы савгасы маглі-б значна ўзьняць засеў хлеба. Але задача гэтым не абмяжоўваецца. Маецца пастанова савецкай улады, у моц якой арганізуюцца ў раёнах вольных ад сялянскіх надзелаў, новыя буйныя савгасы (ад 10 тысяч да 30 тысяч дзесяцін кожны), якія павінны даць праз 5-6 год мілёнаў 100 пудоў таварнага хлеба. Арганізацыю гэтых савгасаў ужо распачалі. Задача складаецца з таго, каб правесьці ў жыцьцё гэтую пастанову савецкай улады, чаго бы то ні каштавала. Я думаю, што пры ўмове выкананьня гэтых задач мы маглі-б дамагчыся таго, каб мець ад старых і новых савгасаў праз 3-4 гады мілёнаў 80-100 пуд. таварнага хлеба.

3) Выхад, урэшце, у тым, каб сыстэматычна ўзьнімаць ураджайнасьць дробных і сярэдніх індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Мы ня можам і не павінны падтрымліваць індывідуальную буйную сялянскую кулацкую гаспадарку. Але мы можам і павінны падтрымліваць індывідуальную дробную і сярэднюю сялянскую гаспадарку, уздымаючы яе ўраджайнасьць і ўцягваючы яе ў логва каапэрацыйнай арганізаванасьці. Задача гэта старая, агалошаная ў нас з асаблівай сілай яшчэ ў 1921 годзе пры замене харчразьвёрсткі харчпадаткам. Гэта задача пацьверджана нашай партыяй на XIV і XV зьездах. Важнасьць гэтай задачы падкрэсьліваецца цяпер цяжкасьцямі на хлебным фронце. Таму яна, гэтая задача, павінна выконвацца з гэткай жа настойлівасьцю, з якой будуць выконвацца першыя дзьве задачы—задача аб калгасах і задача аб савгасах.

Усе даныя гавораць, што ўраджайнасьць сялянскае гаспадаркі можна было-б узьняць у працягу некалькіх гадоў процантаў на 15-20. Зараз у нас ужываецца ня менш 5 мільёнаў сох. Адна толькі замена іх плугамі магла-б даць сур'ёзны прырост ураджаю хлеба ў краіне. Я ўжо не кажу аб дастаўцы сялянскім гаспадаркам вядомага мінімуму ўгнаеньня, ачышчанага насеньня, машын дробнага тыпу і г. д. Мэтад кантрактацыі, мэтад падпісаньня дагавораў з цэлымі вёскамі і сёламі для дастаўкі ім насеньня і г. д. пры абавязковай умове атрыманьня ад іх адпаведнае колькасьці хлебных прадуктаў,—гэты мэтад зьяўляецца лепшым мэтадам узьняцьця ўраджайнасьці сялянскіх гаспадарак і ўцягненьня сялян у каапэрацыю. Я думаю, што пры сур'ёзнай працы ў гэтым напрамку мы маглі-б мець гады праз 3-4 ня менш 100 млн. пудоў новага таварнага хлеба ад дробных і сярэдніх індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

Такім чынам, пры ўмове выкананьня ўсіх гэтых задач мы маглі-б мець праз 3-4 гады ў распараджэньні дзяржавы новых 200-250 млн. пудоў таварнага хлеба, якога-б было больш менш даволі для таго, каб адпаведным чынам манэўравадць як унутры краіны, так і па-за межамі яе.

Вось у асноўным мерапрыёмствы, неабходныя для таго, каб выйсьці з цяжкасьцяў на хлебным фронце.

Злучыць гэтыя асноўныя мерапрыёмствамі з бягучымі мерапрыёмствамі па палепшаньню плянаваньня ў галіне дастаўкі па вёску тавараў, вызваліўшы нашыя гандлёвыя арганізацыі ад абавязку дастаўкі хлеба цэламу шэрагу дробных і сярэдніх гарадоў,—вось цяпер нашая задача.

Ці не належыць побач з гэтымі мерапрыёмствамі ўхваліць яшчэ шэраг іншых мерапрыёмстваў, скажам, мерапрыёмстваў па прыпыненьню тэмпу разьвіцьця нашае індустрыі, рост якое стварае ўзмоцнены попыт на хлеб, апераджаючы пакуль што рост засеву таварнага хлеба? Не, не належыць. Ні ў якім выпадку. Прыпыніць тэмп індустрыі—значыць паслабіць рабочую клясу, бо кожны крок наперад у справе разьвіцьця індустрыі, кожная новая фабрыка, кожны новы завод яўляюць, водлуг слоў Леніна «новую крэпасьць» рабочае клясы якая ўзмацняе яе пазіцыі ў барацьбе з дробнабуржуазнай стыхіяй, у барацьбе з капіталістычнымі элемэнтамі нашае гаспадаркі.

Можа быць трэба было-б для большае «асьцярожнасьці» затрымаць разьвіцьцё цяжкае прамысловасьці з тым, каб зрабіць лёгкую прамысловасьць, працуючую, галоўным чынам, на сялянскі рынак, базаю нашае індустрыі. Гэта было-б самагубствам, падрываў усяе прамысловасьці, у тым ліку і лёгкае прамысловасьці. Гэта азначала-б адыход ад лёзунгу індустрыялізацыі нашае краіны, ператварэньне нашае краіны ў дадатак капіталістычнае сыстэмы гаспадаркі. Мы грунтуемся тут на вядомых кіраўнічых палажэньнях Леніна, дадзеных ім на IV кангрэсе Камінтэрну і, бязумоўна, абавязковых для нашае партыі. Вось што казаў наконт гэтага Ленін па IV кангрэсе Камінтэрну:

«Мы ведаем, што ратункам для Расеі зьяўляецца ня толькі добры ўраджай у сялянскай гаспадарцы,—гэтага яшчэ мала, ня толькі добры стан лёгкае прамысловасьці, дастаўляючы сялянству рэчы спажываньня,—гэтага яшчэ мала, нам неабходна таксама і цяжкая індустрыя».

Як будзе стаяць справа з саюзам рабочых і сялян у зьвязку з намечанымі мерапрыёмствамі? Я думаю, што гэтыя мерапрыёмствы могуць толькі палегчыць справу ўмацаваньня саюзу рабочых і сялян. І на справе, калі калектыўныя і савецкія гаспадаркі будуць разьвівацца паскораным тэмпам; калі ў выніку простае дапамогі дробным і сярэднім сялянам ураджайнасьць іх гаспадарак будзе ўзьнімацца, а каапэрацыя будзе ахапляць усё больш шырокія масы сялянства; калі дзяржава атрымае новыя сотні мільёнаў пудоў таварнага хлеба, неабходнага для маноўраваньня; калі ў выніку гэтых і падобных ім мерапрыёмстваў кулацтва будзе паступова перамагацца,—дык ці-ж ня ясна, што супярэчнасьці між рабочай клясай і сялянствам унутры саюзу рабочых і сялян будуць пры гэтым усё больш і больш вглажвацца, патрэба ў надзвычайных мерах па загатоўцы хлеба будзе адпадаць, шырокія масы сялянства будуць усё больш паварачвацца ў бок калектыўных формаў гаспадаркі, а барацьба за перамогу капіталістычных элемэнтаў на вёсцы будзе набываць усё больш масавы і арганізаваны характар.

Належыць мець толькі на ўвазе, што саюз рабочых і сялян ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ня ёсьць просты саюз. Гэта ёсьць асобная форма клясавага саюзу рабочае клясы і працоўных мас сялянства, якая ставіць сабе мэтаю: а) узмацненьне пазіцый рабочае клясы, б) забясьпечаньне кіруючае ролі рабочае клясы ўнутры гэтага саюзу, в) зьнішчэньне клясаў і клясавае грамады. Усякае іншае разуменьне саюзу рабочых і сялян ёсьць апартунізм, меншавізм, эсэрства,—усё што хочаш, толькі не маркізым, толькі не ленінізм.

Як сумяшчыць ідэю саюзу рабочых і сялян з вядомым палажэньнем Леніна аб тым, што сялянства зьяўляецца «апошняй капіталістычнай клясай»? Ці няма тут супярэчнасьці? Супярэчнасьць тут толькі нам здаецца. А сапраўды, тут няма ніякае супярэчнасьці. У тым-жа самым дакладзе на IV кангрэсе Камінтэрну, дзе Ленін характарызуе сялянства, як «апошнюю капіталістычную клясу», у тым-жа самым дакладзе Ленін яшчэ і яшчэ раз абгрунтоўвае неабходнасьць саюзу рабочых і сялян, заяўляючы, што «вышэйшы прынцып дыктатуры—гэта падтрыманьне саюзу пралетарыяту з сялянствам, каб ён мог утрымаць кіраўнічую ролю і дзяржаўную ўладу".

Як трэба разумець палажэньне Леніна аб тым, што сялянства ёсьць „апошняя капіталістычная кляса»? Ці ня значыць гэта, што сялянства складаецца з капіталістаў? Не, ня значыць. Гэта значыць, папершае, што сялянства зьяўляецца асобнай клясай, будуючай гаспадарку на аснове прыватнае ўласнасьці на прылады і сродкі вытворчасьці ў адзнаку ад клясы пралетарыяў, будуючых гаспадарку на аснове калектыўнае ўласнасьці на прылады і сродкі вытворчасьці. Гэта значыць, падругое, што сялянства зьяўляецца такой клясай, якая вылучае з свайго асяродку, стварае і харчуе капіталістаў, кулакоў і інш. эксплёататараў.

Ці не зьяўляецца гэтая акалічнасьць непераможнаю перашкодаю для справы арганізацыі саюзу рабочых і сялян? Не, не зьяўляецца. Саюз пралетарыяту з сялянствам ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ня ёсьць саюз з усім сялянствам. Саюз пралетарыяту з сялянствам зьяўляецца саюзам рабочае клясы з працоўнымі масамі сялянства. Такі саюз ня можа быць трывалым без арганізацыі беднаты, як апоры рабочае клясы на вёсцы. Таму саюз рабочых і сялян у сучасных умовах дыктатуры пралетарыяту можа быць ажыцьцёўлен толькі пад вядомым лёзунгам Леніна: абапіраючыся на беднату, наладжвай трывалы саюз з серадняком, ні на хвіліну ня спыняй барацьбу з кулацтвам.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

КАМІСІЯ ЦК І ЦКК КП(б)Б Ў ВІЦЕБСКУ.

Віцебск, 6-VI. У сувязі з выкрытымі хворымі зьявішчамі па фанэрным заводзе, спраўдоме, сярод судовых працаўнікоў, Белпайгандлю, Хлебапрадукту, некаторых вясковых райёнах і г. д. ЦК і ЦКК КП(б)Б вызначылі спэцыяльную камісію для абсьледваньня працы Віцебскай арганізацыі. У камісіі ўваходзяць сакратар ЦК т. Васілевіч, сябра бюро ЦК т. і сябра прэзыд. ЦКК т. Конаш.

Камісія 31 мая прыехала ў Віцебск і пачала працу.

КАНТРАКТАЦЫЯ ПАСЕВАЎ.

Магілеў, 6-VI. Па кантрактацыі пасеваў Шклоўскі райён ня мае сапраўдных: ён выканаў 50 процантаў акруговага заданьня.

За ім па колькасьці закантрактаваных пасеваў ідзе Хоцімскі райён. Найгорш—у Чачэвіцкім, Кіраўскім і Журавіцкім райёнах, адкуль значную частку дадзеных на іх пасеваў і перадалі ў крэдытныя таварыствы другіх райёнаў.

Новы закон па с.-г. падатку--наш закон.

Так ацаніў пленум Бабоўскага сельсавету новы с.-г. падатковы закон на 1928-29 г. і ўзяўся за вучот аб'ектаў абкладаньня. Неземляробскіх прыбыткаў ужо падлічана больш як 6000 рублёў.

Для вучоту па сельсавету ўсіх галін прыбытку складзена з трох асоб камісія, а ў дадатак да яе яшчэ арганізавана праверачная камісія ў складзе 7 чал.

Сябры сельсавету і КСУ прымуць актыўны ўдзел у гэтай кампаніі.

Далейшая пасьпяховая праца ж магчымасьць правільна разьмерк падатак сярод насельніцтва і ў цягу чэрвеня скончыць вучотную кампанію.

Хутка пачнецца пабудова заводу с.-г. машын.

Гомель, 6-VI. ВСНГ БССР загадаў прыступіць да пабудовы ў Гомелі вялікага заводу сельска-гаспадарчых машын.

Згодна пляну, гэты завод будзе штогод выпрацоўваць 60000 арфаў, 40000 сячкарняў, 8000 малатарняў і г. д.

Прадукцыя заводу будзе збывацца як у межах БССР, так і ў Смаленскай і Бранскай губэрнях.

Завод будзе будавацца з такім разьлікам, каб у будучым годзе ён быў-бы гатоў.

Пабудова заводу будзе каштаваць—4300000 руб.

Праэкт заводу ўжо зацьверджан у цэнтры.

Ашчадная справа пашыраецца.

Нядаўна на пасяджэньні РВК заслухан даклад аб становішчы ашчадных кас на райёну. З дакладу выявілася, што ў 5 касах назначаны укладчыкаў. Лепш за ўсіх працуе хінская каса.

Усяго ўкладчыкаў па райёну ... чал. Сярод іх найбольш сялян. Уклады апошніх складаюць 14354 руб. працягу мая м-ца праведзен ... ашчадных кас, які адзначыўся ... вым уступленьнем працоўных у ... ашчаднасьці. Лік укладчыкаў ... што падвоіўся.

Рагачэўскі р. «Я. Крушына».

ШКОЛЫ СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ ДЛЯ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

Нар. Кам. Асьветы адчыняе сёлета дзьве новыя школы сялянскай моладзі, з якіх адну спэцыяльна для хатышоў і другую для літоўцаў.

Латыская школа будзе знаходзіцца ў Віцебскай акрузе і Літоўская—у Магілеўскай акрузе.

НОВЫЯ КАЛГАСЫ.

Магілеў, 6-VI. На гэты час па акрузе арганізавана 53 новыя калгасы, з якіх 3 камуны (па пляне прызначалася 35 калгасаў).

Па іншых каапэрацыйных аб'яднаньнях плян пакуль-што выкананы (з 144 каапэратываў па пляну створана толькі 65), але ў працягу летняга часу трэба чакаць ня толькі выпаўненьня пляну, але і перавышэньня яго.

Крэдытаваньне калгасаў адбываецца пасьпяхова. У паасобных выпадках разьмер крэдыту даходзіць да 500 рублёў на двор.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ КРАЯВУЮ КАМІСІЮ.

Полацак, 6-VI. З 1-га чэрвеня ... 1-е ліпеня рэдакцыяй «Чырвонай ... лаччыны» сумесна з АСПС і ... леньнем ЦРК праводзіцца конкурс ... лепшую і горшую краяўую ... Полацкага ЦРК. Лепшым краяўым ... місіям будуць выдадзены прэміі.

РОСТ С.-Г. АРЦЕЛЯЎ.

Ворша, 6-VI. У Дубровенскім ... ёне ва ўсю шырыню пачала разгортвацца праца па калектывізацыі ... На працягу некалькіх месяцаў ... ганізавана 5 новых сельска-гаспадарчых арцеляў, у якіх аб'яднана ... пераважна, бядняцкія гаспадаркі.

У сучасны момант відаецца ... нёная падрыхтоўка да арганізацыі яшчэ пяці сельска-гаспадарчых арцеляў.

Для правядзеньня працы па ... тывізацыі вылучаны спэцыяльны ... ном.

Сяляне бачаць карысьць ад ... тыўнага жыцьця і самі з ахвотай ... ць згоду на ўваход у арцелі.

Пазыка узмацненьня сялянскай гаспадаркі

Купіўшы пазыку --не прайграеш.

(Ад нашага ўласнага карэспандэнта).

Тыраж 11 сэрыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі прайшоў пры вялізарнай зацікаўленасьці сялянства. Аб гэтым сьведчаць дзесяткі сялянскіх дэлегацый, якія прысутнічалі на тыражу, аб гэтым сьведчыць і тое, што сялянка Мышкавец Марыя з Капаткевіцкага райёну за 68 вёрст на тыраж «прыдыбала» пехатою. І такіх сялянскіх дэлегатаў было шмат.

Тыраж гэтай пазыкі паказаў, што сялянства Мазырыччыны вусім сьвядома і правільна ацэньвае пазыковую палітыку савецкае ўлады, стараецца шырэй і шырэй праводзіць распаўсюджваньне пазыкі на вёсцы.

На тыражу сялянства Мазырыччыны і іншых округ Беларусі і Украіны выявіла, наколькі цяжка была праца па распаўсюджваньню пазыкі і ня гледзячы на вялікія перашкоды з боку заможных, кулацкіх груповак вёскі—бядняцка-серадняцкая частка вёскі актыўна падтрымала ўладу сваю ў справе распаўсюджваньня пазыкі.

— Купляйце аблігацыі, на іх вы можа выйграць, а калі і ня выйграеце, то ўсё-ж-такі і не прайграеце — вось якую простую і праўдзівую агітацыю, па словах аднаго з сялян-дэлегатаў, праводзіла контрагентура на вёсцы. І тут на тыражу гэтыя словы пацьвердзіліся. Кожны сялянін-дэлегат райёну са здавальненьнем запісваў прыпаўшыя на яго райён выйгрышы.

Тыраж у Мазыры зрабіў свой практычны ўплыў і на дадатковае распаўсюджваньне пазыкі. За адзін толькі вечар першага пасяджэньня тыражнай камісіі кіёскам Дзяржбанку было прададзена аблігацый пазыкі на 600 р. Агульны продаж аблігацый за ўсе дні тыражу пераваліў да дзьве тысячы рублёў.

На апошнім пасяджэньні тыражнай камісіі прысутнічала вялізарная колькасьць народу. Выйгрышы ў 500 р. выпалі на нумары **87995, 109975, 21513, 234239, 73961 і тысячарублёвы выйгрыш на нумар 80185.**

Пасьля тыражу адбылася ўрачыстая нарада дэлегатаў ад сялянства.

І тут у адзін голас сяляне ўхвалілі пазыковыя мерапрыёмствы савецкай улады.

Мазыр. **А. Дамброўскі.**

1-ШЫ ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ АДЗІНАЦЦАТАЙ СЭРЫІ, ЯКІ АДБЫЎСЯ У ГОР. МАЗЫРЫ.

2-га чэрвеня 1928 г. на ранішнім і вячэрнім пасяджэньнях тыражнай камісіі разыграна 470 выйгрышаў па 50 руб. кожны, якія прыпалі на наступныя нумары гадашы вышэйпамянёнай сэрыі.

| | | | | |

Жыцьцё і праца асьветніка.

Да нарады працаўнікоў пэдагагічных тэхнікумаў.

Па прыкладу мінулага году Народны Камісарыят Асьветы настанавіў на 15-га чэрвеня г. г. склікаць нараду працаўнікоў пэдагагічных тэхнікумаў.

У мінулым годзе нарада праводзіла сваю працу пад лёзунгам «Перагляд і стабілізацыя праграм для пэдтэхнікумаў», якія ўжываліся на працягу двух гадоў і амаль штогодна прыходзілася рабіць тыя ці іншыя зьмены. Зразумела, што зьмены вымагаліся жыцьцёвай необходнасьцю і толькі пасьля пяцігадовага ўжываньня можна было ў 1927 годзе гаварыць аб іх стабільнасьці.

Праграмныя пытаньні ў гэтым годзе не вымагаюць ужо грунтоўных зьмен і перапрацовак, а толькі некаторых карэктыў у сэнсе перастаноўкі матар'ялаў з аднаго на другі год навучаньня для больш раўнамернай нагрузкі кожнага году.

Галоўнымі моментамі ў працы нарады г. г. павінны стаць пытаньні, якія зьвязаны з падрыхтоўкай працаўнікоў да непасрэдна- практычнай вытворчай працы--пэдпрактыкум.

Пэдпрактыкум у пэдтэхнікумах яшчэ і да гэтага году ня мае сваей аднастайнасьці. Кожны пэдагагічны тэхнікум праводзіць яе па-сваему. Праўда, усе пэдтэхнікумы маюць вопытна-практыкавальныя школы, дзе адбываюць студэнты 3 і 4 курсаў сваю практыку, але кожнаму вядома, што практыкі ў адной вопытна-практыкавальной школе мала, бо ўмовы і сама праца ў вясковай масавай школе зусім ня тыя, якія маюцца ў вопытной школе. Многія пэдтэхнікумы, акрамя практыкі ў вопытной школе, праводзяць яшчэ і ў масавай школе пад непасрэдным кіраўніцтвам сваіх настаўнікаў. Але калі наглядзець на гэтую масавую практыку, дык аказваецца што яна вельмі разнастайная па сваёй арганізацыі. У адных пэдтэхнікумах практыкуюцца так—дэручаць студэнту пазнаёміцца з вясковай школай у часе зімовых канікул, а пасьля далажыць аб сваім знаёмстве на пэдсавеце, а другія практыкуюць правядзеньне масавае практыкі ў час зімовых заняткаў (у лютым або сакавіку, з перарывам вучобы ў пэдтэхнікуме). У гэтае пытаньне трэба ўнесьці яснасьць і аднастайнасьць, бо вопыт розных спосабаў падыходу да масавае практыкі ўжо ёсьць і можна выбраць адзін з лепшых.

Разам з абгаварваньнем пытаньня «Сыстэма пэдагагічнага практыкуму ў пэдагагічных тэхнікумах», аб якой паставлен спэцыяльны даклад віцебскіх пэдтэхнікумаў (бел. і яўрэйск.) «Практыка ў масавай школе» ад магілёўскага Белпэдтэхнікуму. На абгаварваньне нарады ставіцца пытаньне—«Характар вопытна практыкавальных школ». Да апошняга году пры пэдтэхнікумах былі поўныя (1—7) сямігодкі, тады як пэдтэхнікум мае на мэце і рыхтуе працаўнікоў толькі для першага канцэнтру 7-годкі і масавае 4-х гадовае школы, а другі канцэнтр 7-годкі зусім непатрэбен пры пэдтэхнікумах, бо настаўнікаў для другога канцэнтру 7-годак рыхтуе Пэдфак Бел. Дзярж. Ун-тэту, пры якім і павінен існаваць гэты тып школы.

Значная частка кіраўнікоў пэдагагічных цыкляў у пэдтэхнікумах высоўваюць гэтае пытаньне і яно павінна знайсьці сваё вырашэньне на нарадзе.

Выходзячы з запатрабаваньняў Беларусі, дзе ўсе школы будуюцца з сельска-гаспадарчым ухілам, настаўнік павінен мець веды па сельскай гаспадарцы.

Пры большасьці пэдагагічных тэхнікумаў маюцца спэцыяльныя зямельныя фэрмы для сельска-гасп. практыкуму студэнтаў, але ён яшчэ не атрымаў свайго канчатковага арганізацыйнага афармленьня і ня мае пэўнага вёзна будзе заняцца вырашэньнем і дакладаў двух тэхнікумаў—Менскага Беларускага і Чырвона-Бярэскага Агрэтэхнікуму.

Пэдагагічны і Сельска-гаспадарчы практыкумы зьяўляюцца асноўнымі пытаньнямі нарады, але не апошняе месца займаюць і другія пытаньні, як абгаварэньне арганізацыі і мэтадаў працы Менскага Беларускага і Гомельскага Яўрэйскага пэдтэхнікумаў, справаздачы якіх стаяць у парадку дня нарады.

Нарада працаўнікоў пэдтэхнікумаў павінна будзе разглядзець навучальны плян пэдтэхнікумаў і ўнесьці некаторыя зьмены, якія вымагаюцца самім жыцьцём. Так, напрыклад: па думцы многіх кіраўнікоў пэдтэхнікумаў высоўваецца пытаньне аб адводзе пэўнага ліку гадзін на чужаземную мову (нямецкую, або ангельскую, ці іншую) бо і сапраўды, адчуваецца некаторы разрыў паміж сямігодкай і В. Н. У., дзе чужаземная мова вывучаецца, а ў тэхнікуме не; увядзеньне краязнаўства як асобнай дысцыпліны для падрыхтоўкі мэтадыстых па краязнаўству, бо краязнаўчыя арганізацыі растуць, а сталых кіраўнікоў мала, аб гэтым ужо маецца пастанова Навукова-Мэтадалёгічнага Камітэту Н. К. А.

Апошнім пытаньнем нарады будуць справаздачы тых пэдтэхнікумаў, пры якіх маюцца слухачы «Пэдтэхнікум на даму», каб на падставе некаторага вопыту, на працягу аднаго году, зрабіць падагульненьне гэтай працы і вызначыць далейшыя шляхі яе разгортваньня. Пасьля справаздач будуць разьмяркованы сродкі, якія адпушчаны Н. К. А. на ўзмацненьне працы па самаадукацыі вясковага настаўніцтва пры дапамозе пэдтэхнікумаў пры «Пэдтэхнікум на даму».

Усе працаўнікі пэдагагічных тэхнікумаў і асабліва тыя, якія маюць выступіць з дакладамі, павінны заўчасна абмеркаваць усе закранутыя пытаньні на сваіх пэдагагічных саветах, а дзе магчыма, то і на шырэйшых сходах, з удзелам студэнтаў, каб мець пэўную думку і погляд па таму ці іншаму пытаньню павесткі дню нарады пры яго вырашэньні.

На нараду заклікаюцца ўсе дырэктары пэдтэхнікумаў, загадчыкі навучальнае часткі, кіраўнікі пэдаёга-пэдагагічных цыкляў і кіраўнікі пэдпрактыкуму, прадстаўнікі пралетэстуду, а таксама загадчыкі і настаўнікі вопытна-практыкавальных школ пры пэдтэхнікумах.

Прысутнасьць на нарадзе дырэктароў пэдтэхнікумаў і загадчыкаў навучальнае часткі абавязкова, а для ўсіх іншых пажадана.

Нарада працягнецца тры дні (15-17-VI). Удзельнікі будуць забясьпечаны толькі інтэрнатамі. Ніякіх сродкаў ад Н. К. А. выдавацца ня будзе.

Аніхоўскі.

За несваечасовую выплату пэнсіі настаўнікам вінаватыя прыцягнуты да адказнасьці.

Ня гледзячы на тое, што і па партыйнай і па савецкай лініі маюцца самыя катэгарычныя дырэктывы аб своечасовай выплаце зарплаты, мы назіраем у апошні час, што ў шмат якіх райёнах працаўнікам, атрымліваючым пэнсію па мясцоваму каштарысу (працасьветы, мэдсанпрацы), выплата пэнсіі затрымліваецца ў некаторых выпадках аж да 2-х месяцаў. Напрыклад: Сьмілавіцкі РВК ня выплаціў да 26-га мая настаўнікам за красавік месяц, Бярэзінскі—за красавік выплаціў толькі ў апошніх лічбах мая, Заслаўскі РВК зацягнуў выплату за травень месяц да гэтых дзён і апрача гэтага ня выдаў згодна калектыўнага дагавору кватэрных грошай за ўвесь бюджэтны год, тады як грошы павінны выдавацца штомесячна разам з выплатаю пэнсіі.

ЦП Працасьветы зараз жа па атрыманьні гэтых вестак перадало справы паказаных РВК пракурору Менскай акругі з просьбаю прыцягнуць старшынь РВК да крымінальнае адказнасьці.

Апрача гэтага, ЦП другі раз катэгарычна прапанавала раймясцкомам працасьветы Менскае акругі, а таксама і акруговым праўленьням саюзу прымаць самыя рашучыя меры, каб пэнсія выплачвалася своечасова і разам з гэтым зараз-жа паведамляць ЦП аб выпадках несваечасовай выплаты пэнсіі альбо нявыкананьня калектыўнага дагавору.

Сэкратару Сьмілавіцкага РМК т. Шатэрніку за несваечасовае паведамленьне прэзыдыум ЦП працасьветы вынес вымову.

А. П.

Наша хроніка.

○ На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦП саюзу Белпрацасьветы прапанована ўсім прафорганам праверыць своечасовасьць выплаты пэнсіі асьветнікам і ў выпадку затрыманьня пэнсіі з боку адміністрацыйных устаноў прымяняць кіраўнікоў апошніх да адказнасьці.

○ Прэзыдыум ЦП саюзу працасьветы разьмяркаваў дзьвесьці дваццаць сядзячых на 50 проц. экскурсыйных літароў па БССР для паездкі асьветнікаў у далёкія экскурсіі.

○ Прэзыдыумам ЦП складзена спэцыяльная камісія па вывучэньню магчымасьці рацыналізацыі канцэлярскай справы, шляхам скарачэньня папяровай перапіскі ў ЦП і МК.

○ У гэтым годзе ЦП саюзу для асьветнікаў Менскай акругі закупіла і разьмеркавала 70 курортных месц, 32 месцы ў дамы адпачынку Крыму і Каўказу і ЦК саюзу і 317 месц у мясцовы дом адпачынку ў Ждановічах.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ Т-ВА „ПРЭЧ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ".

Па дакладах т. т. Брыгневіча і Капаевіча разгарнуліся шырокія спрэчкі.

Тав. Баліцкі гаворыць, што на пытаньні ліквідацыі няпісьменнасьці мы павінны асабліва завастрыць увагу. Задача гэта вельмі важная і вымагаецца культурнай рэвалюцыяй. Тав. Баліцкі ня згодзен з ацэнкай т. Брыгневічам становішча працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. З дакладу т. Брыгневіча відаць, што ў гэтай галіне намі зроблена вельмі мала. Тэмп ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР значна большы, чым у РСФСР. Далей т. Баліцкі прыводзіць лічбы росту агульнай пісьменнасьці ў нас і ў РСФСР; з гэтых лічбаў відаць, што пісьменнасьць у БССР павялічваецца больш шпаркім тэмпам, чым у суседняй рэспубліцы. Завастраючы ўвагу на ліквідацыі няпісьменнасьці, мы ні ў якім разе ня можам і не павінны памяншаць нашы дасягненьні: гэта праца ішла і нельга сказаць, што намі нічога ня зроблена. Вялікую працу па ліквідацыі няпісьменнасьці вядзе наша настаўніцтва, і хто, як не яно, арганізоўвае лікпункты і працуе на іх.

— Тэмп ліквідацыі трэба мінімум падвоіць і галоўнай ударнай групай павінна быць настаўніцтва,—заканчывае сваю прамову т. Баліцкі.

Палітасьветпрацаўнікі з ацэнкай 'ня згодны.

Нам зусім зразумела, чаму прадстаўнікі з месц—працаўнікі палітасьветы—ня згодны з ацэнкай становішча працы па ліквідацыі няпісьменнасьці, бо, як сказаў т. Чарвякоў, у дакладзе т. Брыгневіча дасталася ўсім, і таму кожны з працаўнікоў палітасьветы пытаецца даказаць, што праца стаіць ня так ужо кепска.

Сродкі скарыстоўваюцца не па прызначэньні.

— На сродкі, вызначаныя для ліквідацыі няпісьменнасьці, на мясцох утрымоўваюцца вячэрнія школы сялянскай моладзі і часам школы сацвыхову; адным словам, ідуць не па прызначэньні,—кажа прадстаўнік ад Магілева т. Гольшварц.

— На гэтыя сродкі ўтрымоўваюцца працаўнікі піянэр-руху; яны ідуць на аплату тэхнічных працаўнікоў райвыканкомаў і г. д.,—адзначае ў сваім выступленьні прадстаўнік ад Менску т. Дзівалоўскі.

—Калі трэба скарачаць бюджэт,дык райвыканкомы ў першую чаргу «рэжуць» каштарысы па нарасьвеце,—гаварылі некаторыя таварышы.

З гэтай хваробай трэба павесьці самую рашучую барацьбу, бо пры нашай агульнай няпісьменнасьці павінна кожная капейка па нарасьвеце пайсьці на сваё мэтавае прызначэньне.

Няма вучоту працы.

Прадстаўнікі з месц—працаўнікі палітасьветы кажуць, што праца па ліквідацыі няпісьменнасьці пасоўваецца наперад.

— Мы сёлета выпускаем з лікпунктаў да 5000 чал.,—кажа прадстаўнік Гомельшчыны.—Лікпунктамі Меншчыны ахоплена каля 10000 чалавек,—дабаўляе тав. Хоцька.—У Мазыршчыне было ахоплена да 8000 чал., а скончаць ня больш 40 проц.,—заўляе т. Драп. Але ніхто з гэтых таварышоў ня можа ўзяць на сябе адказнасьць за тое, што лічбы правільныя. Усё гэта прыблізна, па апошніх вестках і г. д. Ясна адно, што сталага вучоту нашай часам і вялікай працы ўсё яшчэ няма. Прадстаўнік Астрашыцка-Гарадзецкага райёну настаўнік Непартовіч кажа, што ў параўнаньні з мінулымі гадамі праца па ліквідацыі няпісьменнасьці вядзе наша настаўніцтва, і хто, як не яно, арганізоўвае лікпункты і працуе на іх.

Барысаўскія недарэчнасьці.

— У апошнія часы ў Барысаве праца т-ва „ПН" заняпала,—кажа тав. Страгуцкі.—Мы часта на розных сходах ставім даклады, але далей рэзалюцый наперад ня рухаемся. Хацелі арганізаваць ячэйку на гарадзкім камбінаце, але вавком дагэтуль ня даў магчымасьці зрабіць на сходзе рабочых інфармацыю—усё кормяць «завтракамі». Саюзы—мэдсанпрацы, камунальчікаў і фабком фабрыкі «Прафінтэрн» не дапамагалі ў працы таварыству і нават у канцы заявілі, **што лікпункты ім не патрэбны, а яны займуцца індывідуальнай ліквідацыяй няпісьменнасьці.**

Аб тым, што вакол пытаньня ліквідацыі няпісьменнасьці не згуртавана грамадзкая думка, і што саюзы ўдзяляюць мала ўвагі гэтаму важнаму пытаньню, гаварыў ня толькі прадстаўнік Барысава: аб гэтым гаварылі ўсе выступаўшыя ў спрэчках таварышы; гэта-ж мы бачылі і з дакладаў т. т. Брыгневіча і Капаевіча.

Стабільнасьць няпісьменнасьці ёсьць—

кажа прадстаўнік Мазыршчыны тав. Драп. Мы бачым, што ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці назіраецца за апошнія гады стабільнасьць.

— Колькасьць няпісьменных не павялічваецца і не памяншаецца,—гаворыць тав. Драп. Апошні год тэмп ліквідацыі няпісьменнасьці зьменшыўся,—адзначае і старшыня рэвізійнай камісіі т. Бялуга. Згаджаецца з гэтым тав. Левін, які таксама адзначае, што назіраецца рэцыдыў у тых, якія скончылі лікпункты.

Настаўніцтва прымае ўдзел у ліквідацыі няпісьменнасьці.

Прадстаўнік ЦП саюзу працасьветы тав. Мацюкевіч не згаджаецца з вывадамі тав. Брыгневіча. У нас няма дадатковых пэўных лічбаў, каб можна было даказаць стабільнасьць у ліквідацыі няпісьменнасьці. Няма сталага вучоту і лічбаў ні ў т. Брыгневіча, ні ў Наркамасьветы.

У вывадах гаворыцца, што настаўніцтва ня прымае ўдзелу ў арганізацыі лікпунктаў. А хто, як не настаўнікі іх арганізоўваюць? Самы галоўны недахоп—гэта няўвязка ў аплаце настаўніцтва за працу па ліквідацыі няпісьменнасьці, а таму мы і назіраем частковы адыход настаўнікаў ад гэтай працы. Трэба гэта пытаньне ўрэгуляваць,—заканчвае т. Мацюкевіч.

Пэрспэктывы на наступны год.

План НКА прадугледжвае ахапіць лікпунктамі ў 1928-29 г. ня менш 100.000 чалавек. Да гэтай справы будзе прыцягнута ўся савецкая грамадзкасьць, уся інтэлігенцыя.

Па лініі т-ва «ПН» у наступным годзе мяркуецца ліквідаваць няпісьменнасьць ня менш як 25000-30000 чал.

Пастаноўлена правесьці з пачатку верасьня ў БССР агітацыйны месячнік па барацьбе з няпісьменнасьцю, а перад пачаткам месячніка будзе скліканы ўсебеларускі зьезд па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Усе сілы на барацьбу з няпісьменнасьцю.

(З прамовы Старшыні ЦВК БССР. тав. Чарвякова).

— Мы сабраліся для таго, каб ацаніць працу таварыства «П. Н» і вызначыць канкрэтныя шляхі для вышчыньня недахопаў і паляпшэньня далейшай працы.

У артыкуле т. Крупскай аб становішчы працы па ліквідацыі няпісьменнасьці ў РСФСР даводзіцца, што ў РСФСР назіраецца стабілізацыя няпісьменнасьці.

Мне здаецца, што было-б памылкай казаць, што ў нас у БССР справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці стаіць лепш, чым у РСФСР.

Я хацеў-бы, каб няпісьменнасьці ў нас зусім ня было, але я сьцьвярджаю, што памяншэньне няпісьменнасьці ідзе ў нас вельмі марудна. У нас зараз налічваецца 1.836 тысяч няпісьменных, акрамя дзяцей ва ўзросьце 0—8 гадоў.

Мне здаецца, што становішча працы па ліквідацыі няпісьменнасьці лепш ацаніць у горшы бок, чым у лепшы. Гэта будзе лепш, бо праца на мясцох у надзвычайна кепскім становішчы. Усе нашы пляны, якія мы складалі дагэтуль як па ўсесаюзным навучаньні, так і па ліквідацыі няпісьменнасьці,—нявыкананы. Мы і зараз маем такое становішча, што ня можам ахапіць усіх дзяцей школай, а таксама і няпісьменных—лікпунктамі

Мы павінны зрабіць ацэнку працы т-ва на падставе таго, як яно дапамагала весьці работу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Чым была выклікана патрэба ў арганізацыі т-ва «П. Н»?

Па-першае патрэба ў арганізацыі таварыства выклікана надзвычайным імкненьнем нашага насельніцтва да пісьменнасьці. Гэтай пісьменнасьці шукае моладзь, шукае яе рабочы і дарослы селянін. Падругое, імкненьне нашага актыву і ў першую чаргу камсамолу і настаўніцтва выканаць ролю і абавязак культурнага працаўніка. Настаўніцтва не замыкаецца ў службовы мундзір, а імкнецца весьці працу па ліквідацыі няпісьменнасьці ў парадку грамадзкай працы.

Вось два фактары, якія далі магчымасьць у свой час партыі арганізаваць т-ва „Прэч Няпісьменнасьць».

Зараз мы назіраем усё большае і большае імкненьне насельніцтва да пісьменнасьці. Тав. Баліцкі прыводзіў для прыкладу в. Дукорку і некаторыя іншыя, у якіх далкам ліквідавана няпісьменнасьць. Гэтыя прыклады вельмі сьветлыя і цікавыя, але побач з гэтымі адзінкамі ў нас ёсьць шэраг вёсак, дзе большасьць насельніцтва няпісьменна. Аднак, і ў гэтых цёмных кутках мы бачым узрост імкненьня насельніцтва да асьветы. Зразумела, пры такіх абставінах настаўніцтва ня можа быць пасыўным; разам з іншым вясковым актывам яно арганізоўвае ячэйкі і вядзе працу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Мы бачым, што на мясцох арганізоўваюцца ячэйкі, дзе не гаворыць аб «высокіх матэрыях», а вядуць упартую барацьбу з нашым ворагам—няпісьменнасьцю.

Мы-ж, як кіруючая арганізацыя, ня справіліся з сваёй задачай. Пачынаючы ад райёнага да акруговага і нават Цэнтральнага Саветаў т-ва «Прэч Няпісьменнасьць», мы бачым адсутнасьць працы: саветы распадаюцца, арганізоўваюцца і зноў распадаюцца і г. д., адным словам, атрымоўваецца байка пра белага бычка.

Хто тут вінаваты?

Прычыну трэба шукаць у тым, што праца таварыства настаўлена фармальна, і таму больш моцная арганізацыя Галоўпалітасьветы паглынула слабейшую: Галоўпалітасьветы мае сродкі, лікпункты і апарат, і таму ўся праца па ліквідацыі няпісьменнасьці ў большасьці райёнаў абмяжоўвалася працай па лініі Галоўпалітасьветы без дадатковай працы Т-ва.

Я ведаю, што сярод пэўных колаў на падставе гэтага існуе ў адносінах да таварыства ліквідацыйны настрой. Гаворыць так: — існуе Галоўпалітасьветы, ён і павінен займацца ліквідацыяй няпісьменнасьці, а з добраахвотнасьці нічога ня выйдзе. Другія кажуць: няхай дзяржава дае таварыству грошы, і тады разгорнецца праца.

Ліквідацыйныя настроі ў корані няправільны і з імі трэба весьці барацьбу.

Калі т-ва дрэнна працавала да гэтай пары, то гэта ня значыць, што яго трэба ліквідаваць, а значыць, што трэба паленшыць яго працу. Тыя ўмовы, што выклікалі да жыцьця т-ва, у сучасны момант яшчэ больш абвастрыліся. Дзяржава ў бліжэйшыя гады ня зможа забясьпечыць сродкамі ўсіх патрэб культурнага будаўніцтва, а патрэба ў пашырэньні культурнасьці і асьветы в кожным днём усё ўзрастае, усе праблемы сацыялістычнага будаўніцтва ўпіраюцца ў пытаньне культурнасьці. Такім чынам, кожны з нас павінен зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы дзяржаве ў справе культурнага будаўніцтва і ў першую чаргу ліквідацыі няпісьменнасьці. Генэральная задача таварыства «П. Н.»—весьці барацьбу з няпісьменнасьцю сярод дарослага насельніцтва.

На васеньнім пленуме мы паставілі сабе задачу працягваць барацьбу супроць рэцыдыву няпісьменнасьці. Мы казалі, што ў тых гарадох, дзе ліквідацыя няпісьменнасьці амаль што скончана, трэба пашыраць сярод рабочых тэхнічныя веды.

Далей тав. Чарвякоў спыняецца на задачах, якія стаяць перад таварыствам улетку і ўвосень.

— Сказаць, што мы ўлетку зможам працягваць працу па ліквідацыі няпісьменнасьці, гэта значыць заплюшчваць вочы. Наша таварыства ў летні перыяд павінна праз нізавыя ячэйкі наладзіць чытку газэт, цікавай і карыснай літаратуры і ліквідаваць няпісьменнасьць сярод тых, хто гэтага сам дамагаецца. У вёску едзе надзвычайна многа культурных сіл адначываць. Ім трэба даць адначыць, а разам з гэтым іх необходна скарыстаць у агульнай культурнай працы ячэек.

Нам необходна высьветліць лік няпісьменных і распрацаваць плян па ліквідацыі няпісьменнасьці. Да распрацоўкі пляну трэба прыцягнуць нашы нізавыя ячэйкі, моладзь і сельсаветы. Лёзунг—«ніводнай ячэйкі т-ва «П. Н.» без канкрэтнага пляну па ліквідацыі няпісьменнасьці»—павінен быць ажыцьцёўлен. Улетку мы павінны распачаць самую сурёзную падрыхтоўку да восені. Нам трэба за летні сэзон канчаткова распрацаваць мэтады нашай працы.

Наркамасьветы трэба падумаць аб тым, каб за кошт дзяржаўных грошай субсыдыраваць працу т-ва «П. Н.» Нам трэба падахвочваць настаўніка ў іх працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Пытаньне з падручнікамі ў нас стаіць вельмі кепска. Наркамасьветы трэба падумаць аб тым, каб даць падручнікі для лікпунктаў і школ малапісьменных. Хіба ў нас няма культурных сіл, каб скласьці гэтыя падручнікі? А дзе-ж нашы мэтадысты? Наркамасьветы ўлетку праводзіць настаўніцкія курсы: трэба настаўнікам даць тыя грошы, што ідуць на складаньне падручніка, дык настаўнікі складуць добрыя, жыцьцёвыя падручнікі.

Наркамасьветы павінен дабіцца, каб адпушчаныя сёлета на ліквідацыю няпісьменнасьці 300.000 руб. былі забраніраваны і ім быў дадзен правільны напрамак; частка іх павінна быць скарыстана на забясьпечаньне лікпунктаў падручнікамі, паперай і алоўкамі. Трэба зрабіць так, каб быў выбар падручнікаў.

Мы патрабуем, каб ліквідацыю няпісьменнасьці вялі ўсе, нават вучні сямігодкі. А ці дапамагаем мы ліквідатарам з мэтадычнага боку? Мэтадычных указаньняў на мясцох няма, іх трэба выдаць і шырока распаўсюдзіць. Нам трэба таксама дабіцца таго, каб заняткі на лікпунктах распачыналіся не пазьней кастрычніка. Нам трэба падумаць і распрацаваць канкрэтна, што павінны ў штодзённай працы рабіць ячэйка, райсавет і акрсавет таварыства.

Мы ставім мэту—павялічыць лік членаў. Калі да гэтага пытаньня падыйсьці мэханічна, дык у нас будзе мёртвае таварыства. Ці трэба нам паставіць лёзунг—усе ў т-ва «Прэч Няпісьменнасьць»—гэта пытаньне спрэчнае, і яго трэба вырашыць, бо ад правільнага вырашэньня пытаньня залежыць уся наша далейшая праца. Сябрам таварыства ў першую чаргу павінен быць той, хто жадае і хоча выконваць тую ці іншую працу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР.

31-га мая г. г. пад старшынствам тав. **А. Г. Чарвякова** адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ПРАЦЫ СЯЛЯНСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ УЗАЕМАДАПАМОГІ.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад тав. Жарыва аб працы сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

Усіх таварыстваў сялянскае ўзаемадапамогі ў БССР маецца 1496, з іх беларускіх—1461, польскіх—25, латыскіх—5, расейскіх—2, нямецкіх—2 і яўрэйскіх—1, якія яднаюць—1.528.965 членаў.

Беднота і сераднякі прымалі актыўны ўдзел у апошніх перавыбарах камітэтаў, дзякуючы чаму ўдзельная вага незаможнага сялянства і членаў КП(б)Б у складзе сялянскіх камітэтаў павялічылася.

У склад камітэтаў уваходзіць: сялянбеднякоў—68,4 проц, сераднякоў—27 проц., сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў—1,3 пр., служачых—3 пр., заможных—0,3 пр.; па партыйнасьці: членаў КП(б)Б—6,3 проц. (у мінулым годзе—5 проц.),—ЛКСМ—7,4 пр.

Павялічыўся ўдзел жанчын у складзе камітэтаў з 5 пр. да 7,7 пр. пасьля апошніх перавыбараў.

Сяброўскія ўзносы на 1925-26 і 1926-27 г. былі ўстаноўлены па 20 к. з дзесяціны сенапашні. Усяго за 2 гады было налічана 1.039.989 руб., спагнана—239.820 руб, складзена з беднаты—207.997 руб. Слабае спагнаньне сяброўскіх узносаў тлумачыцца непрацаздольнасьцю некаторых працаўнікоў. Фонды камітэтаў увесь час павялічваюцца і на 1-X-27 г. складаюць: 402.287 п. збожжа і 251.241 руб. у наяўнасьці і 653.828 р. у пазычках. У карыстаньні камітэтаў узаемадапамогі знаходзіцца 248 уласных прадпрыёмстваў і 99 арэндаваных; зямельных вучасткаў—1908 дз. пахаты і 1321—дз. сенажаці. Камітэты ўзаемадапамогі маюць вучот беднаты і прымаюць усялякія меры для паленшаньня яго матар'яльнага становішча. Вялікую ролю ў справе дапамогі бедняце камітэты адыгралі ў час пасяўных кампаній, шляхам зарыхтоўкі і выдачы біднейшаму насельніцтву насеньня,ачысткі насеньня, закупкі сельска-гаспадарчага інвэнтару, аказаньня дапамогі працай і гуж. сілай.

У сучасны момант для працоўнай дапамогі арганізаваны пры камітэтах 159 працоўных дружын.

Камітэты на сваіх прадпрыёмствах аказваюць дапамогу беднаце ільготным размолам збожжа на млынох, водпускам бясплатнай і льготнай цэглы з цагельняў, абслугоўваньнем машынамі пракатных пунктаў і г. д.

У агульнай сваёй працы камітэты зьвярталі вялікую ўвагу на аказаньне дапамогі жанчынам-бядничкам.

Райённыя і сельскія камітэты вядуць працу па сацыялістычнаму завабесьпячэньню вёскі. Сельскія камітэты праводзяць абсьледаваньне асоб, маючых патрэбу ў сацыяльным забясьпечаньні.

Усе райённыя і сельскія камітэты саставіць пайшчыкамі крэдытнай кааперацыі. Згодна маючыхся даных, к-тамі кааперавана ўсяго 34806 бядняцкіх гаспадарак.

К-ты сялянскай узаемадапамогі прымалі ўдзел у рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, а таксама купілі аблігацый за ўласныя сродкі на суму 15872 р.

На дакладу Цэнтральнага Камітэту сялянскіх т-ваў узаемадапамогі разгарнуліся спрэчкі, у якіх выказаліся т. т. Масальскі, Гэльтман, Хацкевіч, Чарвякоў, Адзінцоў, Лаўрыновіч.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў утварыць камісію для распрацоўкі праекту пастановы па дакладу ў наступным складзе: т. т. Сташэўскага (старшыня), Масальскага, Ашаровіча, Файнбурга, Лаўрыновіча, Жарына і Адзінцова.

АБ ПЕРАШКОДАХ У ПРАЦЫ ВЫЛУЧЭНКІ-СЯЛЯНКІ Ў МАЗЫРШЧЫНЕ.

У Прэзыдыум ЦВК БССР паступілі 2 лісты ад кандыдата ў члены ЦВК Саюзу ССР т. Дудзіч—сялянкі в. Юркевічы, Жыткавіцкага райёну, Мазырскае акругі. У гэтых лістох т. Дудзіч паказвала на непарадкі і шэраг злачынстваў па мясцох у Мазырскай акрузе, а таксама на тое, што мясцовыя органы ўлады (сельсавет, РВК, акруговыя ўсгаповы) ня толькі не дапамагаюць ёй у працы, як вылучэнцы—кандыдату ў члены ЦВК СССР, а нават часта і перашкаджаюць.

Для праверкі ўсіх акалічнасьцяў, паказаных у лістох т. Дудзіч, Прэзыдыум ЦВК камандыраваў на месца інструктара ЦВК т. Еліна.

На апошнім сваім пасяджэньні Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад т. Еліна аб выніках праверкі ім і членам Прэзыдыуму Мазырскага АВК на месцы ўсіх паказаных т. Дудзіч у яе лістох фактах. З дакладу т. Еліна выявілася, што большасьць тых злачынстваў, аб якіх пісала т. Дудзіч, пацьвердзіліся. Тав. Еліным былі знойдены таксама вельмі няўважлівыя адносіны з боку мясцовай улады да работы т. Дудзіч, а часам нават і кампрамэтацыя яе.

На падставе ўсяго адзначанага, Прэзыдыум ЦВК вынес наступную пастанову:

1. Канстатаваць, што большасьць фактаў, аб якіх пісала т. Дудзіч, у выніку абсьледаваньня, вытварнага на месцы інструктарам ЦВК т. Еліным, разам з прадстаўніком Мазырскага АВК т. Пакроўскім пацьвердзіліся, а іменна: няправільнае разьмеркаваньне лесу і ільгот па с.-г. падатку, п'янства работнікаў сельсавету і няслога ведамства, няправільная рэгістрацыя шлюбу з няпоўналетняю, бязьдзейнасьць органаў юстыцыі і іншых у барацьбе супроць гэтага беззаконьня, недапушчальныя адносіны да т. Дудзіч на толькі як да кандыдата ў члены ЦВК Саюзу ССР, а наогул як да грамадзянкі ў саветах, больніцы, камітэце сялянскай узаемадапамогі і лясьніцтве.

2. Канстатаваць, што з боку савецкіх устаноў акругі ня было дастаткова ўважлівых адносін да работы тав. Дудзіч, дзякуючы чаму яе заявы аб злоўжываньнях ня прымаліся пад увагу, а наадварот, выклікалі з боку асобных працаўнікоў імкненьне скампрамэтаваць т. Дудзіч, як грамадзянку і як вылучэнку.

3. Мазырскаму АВК, якому было даручана праверыць факты, аб якіх паведамляла тав. Дудзіч, і прыняць належныя меры к паленшаньню ўмоў яе працы, абмежаваўся фармальным і няпоўным канстатаваньнем фактаў, ня прыняўшы пры гэтым дастатковых мер к зьнішчэньню вылучаных пэдакопаў і не зрабіўшы належнага ўплыву на адпаведных працаўнікоў.

4. На падставе ўсяго адзначанага, прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

а) даручыць Мазырскаму акрвыканкому зрабіць усебаковае вывучэньне працы ў Тураўскім і Жыткавіцкім райёнах дзеля таго, каб на падставе гэтага вывучэньня зрабіць адпаведныя мерапрыёмствы, дзякуючы якім у далейшым была-б напраўдзана магчымасьць паказаных злоўжываньняў і стварыліся-б умовы спрыяючыя для працы вылучэнцаў.

Заслухаць праз месячны тэрмін даклад Мазырскага АВК аб выкананьні гэтай пастановы.

б) Даручыць пракурору рэспублікі прыцягнуць да адказнасьці ўсіх працаўнікоў, якія вінаваты ў дыскрэдытаваньні кандыдата ў члены ЦВК Саюзу ССР тав. Дудзіч, а таксама тэрмінова расьсьледаваць усе злоўжываньні, якія выкрыты тав. Дудзіч, у прыватнасьці аб незаконнай рэгістрацыі шлюбу з непаўналетняй і бязьдзейнасьці органаў юстыцыі ў гэтай справе.

в) Прасіць рэдакцыі газэт, на падставе маючыхся матар'ялаў, высьветліць усю гэтую справу ў друку.

г) Лічыць необходным склікаць нараду сяброў і кандыдатаў у члены ЦВК СССР і БССР—сялян і сялянак, працуючых на мясцох, дзеля абгаварэньня з імі пытаньняў аб працы на мясцох і інструктаваньня іх.

Скліканьне гэтай нарады прыстасаваць да бліжэйшай сэсіі ЦВК.

АБ НАГАРОДЗЕ ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА ШТАНДАРУ.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў наградзіць Ордэнам Працоўнага Чырвонага Штандару т. т.: Начальніка Упраўленьня Вайскова-Паветраных Сілтав. Кажэўнікава, Аляксандра Цімафеевіча; 2. Начальніка Вайскова-Санітарнага Упраўленьня т. Віста, Алега Адольфавіча; 3. Начальніка Вайскова-Ветэрынарнага Упраўленьня т. Пятуховіча, Абрама Аронавіча.

Хворае пытаньне.

У саюзе працасьветы значны процант займаюць тэхпрацаўнікі, якія ўцягнуты ў саюз з мэтай іх перавыхаваньня саюзам, як школаю камунізму.

Сярод кваліфікаванай часткі асьветнікаў, складаючай пераважную большасьць сяброў саюзу, тэхпрацаўнікі зьяўляюцца самай адсталай часткай як з агульна-культурнага, так і палітычнага боку. Яны часта губляюцца нізавымі саюзнымі органамі, ведаючымі культасьветнай працай на мясцох, замест таго, каб быць у цэнтры ўвагі.

Добрыя пункты праграм па масавай працы сярод асьветнікаў і ў прыватнасьці сярод тэхпрацаўнікоў, застаюцца ў большасьці на паперы, і адсталая частка саюзу яшчэ далей

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу аб працы Беларускай Станцыі Усесаюзнага Інстытуту Прыкладной Батанікі і Новых Культур.

Заслухаўшы даклад праф. Пісарава аб працы Беларускай Станцыі Усесаюзнага Інстытуту прыкладной батанікі і новых культур, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Лічыць, што агульнасаюзныя заданьні і пасобныя тэмы, пастаўленыя Усесаюзным Інстытутам прыкладной батанікі і новых культур для навуковай распрацоўкі на Беларускай Станцыі адначасна адказваюць і запатрабаваньням сельскай гаспадаркі БССР.

2. Прызнаць правільным і мэтавагодным беспасрэднае абслугоўваньне станцыяй акружаючага насельніцтва, шляхам папулярызацыі сваіх дасягненьняў і агранамічных ведаў, распаўсюджваньня палепшанага насеньня і пасадачнага матар'ялу. Усе гэтыя мерапрыёмствы неабходна ўмацніць і на далейшы час, а таксама ўжыць захады да выданьня работ Станцыі папулярнай літаратуры для сялянства.

3. Лічыць патрэбным, каб праца Беларускай Станцыі Усесаюзнага Інстытуту прыкладной батанікі і навуковых культур была-б увязана з працай іншых навукова-дасьледчых устаноў БССР і, у пасобку, з Беларускім Навукова-Дасьледчым Інстытутам Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Левіна і Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі сельскай і лясной гаспадаркі як шляхам правядзеньня прыцыпаў падзелу працы паміж імі і вынікненьня паралелізму ў працы, гэтак і шляхам супольнай прапрацоўкі шэрагу тэм і пасьлядоўнага скарыстаньня вынікаў дасьледчай працы (гэнэтыка і селекцыя).

4. Лічыць патрэбным, каб Усесаюзны Інстытут прыкладной батанікі і новых культур, апроч ужо пастаўленага, згодна дакладу, на Беларускай Станцыі шэрагу прац Усесаюзнага значэньня (галоўным чынам—па травах), зьвярнуў асаблівую ўвагу на БССР як на асноўны і тыповы бульбовы райён.

5. Лічыць патрэбным, каб Усесаюзны Інстытут прыкладной батанікі і навуковых культур кіраваўся прынцыпам карэнізацыі як пры ўкамплектаваньні штату Беларускай Станцыі навуковымі працаўнікамі, гэтак і пры падборы асьпірантуры ў сваіх цэнтральных установах.

6. Запрапанаваць Менскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту асабліва на працягу месяцу з-пад дзіцячага дому галоўны будынак станцыі.

7. Вызваліць гаспадаркі Беларускай Станцыі ад сельска-гаспадарчага падатку, паводле арт. 43 зацьверджанага Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам Саюзу ССР за 21 красавіка 1928 году „Палажэньня аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку" („Известия" ЦИК СССР и РСФСР 1928 году № 94).

8. Пашырыць дзеяньне пастановы Савету Народных Камісараў БССР за 21 сакавіка 1927 году «Аб маемасных правах—навучальных, навучальна-паказальных і навукова-дасьледчых устаноў БССР, якія знаходзяцца на дзяржаўных і мясцовых бюджэтах і маюць зямельныя гаспадаркі і прадпрыёмствы на спэцыяльных сродках» (З. З. БССР 1927 г. № 15, арт. 57) на гаспадарку Лошыцы Беларускай Станцыі Усесаюзнага Інстытуту прыкладной батанікі і новых культур.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Н. Угараў.

16 мая, 1928 г.
г. Менск.

Шырэй дасьледчую працу ў сельскай гаспадарцы.

Навукова-дасьледчыя ўстановы і пасобныя дасьледчыкі сяляне, хоць і маладыя ў БССР, далі ўжо шмат карысных вынікаў свае працы. Досыць параўнаць прыклады ўраджайнасьці сялянскіх гаспадарак і дасьледчых станцый БССР, каб зразумець неадкладнасьць задач павялічэньня ўраджайнасьці.

Ураджай сялянскіх гаспадарак у сярэднім гэткі: жыта (з дзесяц.)—41,4 пуд., ячмень—40,4 пуд., авёс—34,9 пуд. і бульба—535 пуд.

Ураджай дасьледчых станцый: жыта (з дзес.)—83 пуд., ячмень—94 пуд., авёс—80 пуд. і бульба—830 пуд.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што справа разьвіцьця вытворчых сіл сельскай гаспадаркі—справа ня дыскусій, а практычнай працы.

На жаль, як звычайнае зьявішча, прыходзіцца назіраць вусім слабую сувязь з дасьледчымі ўстановамі шырокіх колаў спэцыялістаў сельскай і лясной гаспадаркі, якія працуюць на абслугоўваньні сялянскіх, савецкіх і актыўных гаспадарак. Ня лепш стаіць справа сувязі дасьледчых станцый непасрэдна з масамі сялянскіх гаспадарак. Арганізацыяй інстытуту сялян-дасьледчыкаў зроблен ледзь першы крок у гэтым напрамку. І гэта ў той час, калі сучасная адсталая гаспадарка павінна быць хуткім тэмпам перабудавана на новых сацыялістычных падставах і больш высокай тэхнічнай базе, вырашаючы практычна праблемы павышэньня ўраджайнасьці і таварнасьці.

Шляхі, канкрэтныя формы і зьместмеры прыёмствуў да практычнай пабудовы новага сацыялістычнага земляробства, незалежнага ад прыродных фактараў—задача ў першую чаргу дасьледчых устаноў з дапамогай вялікай арміі сельска-гаспадарчых спэцыялістаў і піянэраў новага земляробства—сялян-дасьледчыкаў. Сувязь дасьледчых устаноў з спэцыялістамі і сялянамі прынясе вялікую карысьць ня толькі тым, што будзе пашырана скарыстоўваньне аграмаднага—«мёртвага капіталу», але і тым, што праз гэту сувязь дасьледчыкі лепш зразумеюць сучасныя запатрабаваньні сельскай гаспадаркі—лепш пабудуюць праграмы сваёй дзейнасьці на грунце мясцовых першачарговых запатрабаваньняў. У прыватнасьці, трэба больш пашыраць дасьледчую працу па тэхнічных культурах, кораньплодах, ужываньні торфу па ўгнаеньне і інш.

Асноўнымі арганізацыйнымі формамі масавай сувязі шырокіх колаў спэцыялістаў з дасьледчымі станцыямі павінны зьявіцца канфэрэнцыі і экскурсіі па дасьледчай справе на райённых дасьледчых станцыях.

Зямельныя органы на мясцох, кіраўнікі райённых станцый і акруговыя бюро аграсэкцыі павінны вывяць ініцыятыву да абавязковага скліканьня гэтых нарад, пачынаючы з сёлетняга году. Патрэбна дабіцца, каб не засталося ніводнага агранамічнага працаўніка, які быў бы ў старане ад дасьледчае працы. У першую чаргу савгасы і калгасы павінны зрабіцца спажыўцамі вынікаў станцый. Гэтага ад іх трэба дабівацца ў абавязковым парадку з адначасовым разьгортваньнем дасьледчай працы ў цеснай сувязі з дасьледчымі станцыямі. Значную частку навукова-вытвоўчых камандыровак для аграпэрсаналу райёнаў трэба скарыстоўваць на працу ў дасьледчых установах. Пашырэньне інстытуту сялян-дасьледчыкаў і практычнай працы—палепшаньне плянава-арганізаванай сувязі сялян-дасьледчыкаў з дасьледчымі станцыі з райённым аграпэрсаналам будзе асноўнай формай практычнага ўнядрэньня ў сялянскіх гаспадарках элемэнтаў сельска-гаспадарчае культуры. Трэба палепшыць абслугоўваньне сялян-дасьледчыкаў выдзеліўшы са складу дасьледчыкаў працаўнікоў, адказных за сялянскія досьледы. Своечасовае выданьне вынікаў дасьледчых прац з забесьпячэньнем імі ўсіх аграпрацаўнікоў, друкаваньне папулярных брашур па выніках асобных прац і шырокае распаўсюджваньне сярод насельніцтва, пашырэньне ўдзелу дасьледчых станцый у с.-г. часопісах катэгарычна патрэбна і павінна быць практычна ажыцьцёўлена. Дасьледчыкі павінны прыняць больш удзел у грамадзкім жыцьці вёскі, мабілізуючы савецкую грамадзкасьць вакол дасьледаваньня ўсіх галін сельскае гаспадаркі. Лепшую сувязь і практычную працу трэба таксама наладзіць з сельска-гаспадарчымі гурткамі, с.-г. клюбамі і школамі.

Аўчыньнікаў.

ГАСПАДАРЧАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў МЕНСКАЙ АКРУЗЕ.

ПАБУДОВА БАРЫСАЎСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ.

Для гор. Барысава вызначана колькасьць патрэбнай электраэнэргіі ў 300 кілават. Згодна гэтага разьліку і будзе будавацца электрастанцыя ў Барысаве.

Менскі акрыканком прыняў удзел у будаўніцтве гэтай электрастанцыі асыгнаваньнем 150 тысяч рублёў. Гэтыя сродкі будуць адпускацца наступным чынам: у 1927-28 годзе—20.000 руб., у 1928-29 годзе—70.000 руб. і ў 1929 30 годзе—60.000 руб.

Існуючая цяпер у Барысаве электрастанцыя астаецца падалей, як рэзэрвовая.

ПАКАЗАЛЬНЫ БУДЫНАК СЕЛЬСАВЕТУ.

У адным з сельсаветаў Халопеніцкага раёну сёлета будзе будавацца паказальны агнятрывалы будынак сельсавету. Дазвол на пабудову акрыканком ужо даў.

ПРАЭКТ НОВАГА ЗАКОНУ ЗЕМЛЯЎПАРАД (АВАНЬНЯ—НА АБГАВАРЭНЬНЕ МАС.

Зацьверджан плян і парадак абгаварэньня ў вёсках Менскай акругі праэкту закону ЦВК Саюзу ССР па землеўпарадкаваньні і землякарыстаньні.

З 15 чэрвеня на сходах сялян, сельсаветаў, на сходах рабочых, беднаты, работнікаў зямлі і лесу праэкт закону будзе абгаварвацца ў масах. У жніўні праэкт будзе абмяркоўвацца на пленуме АВК. Абгаварэньне праэкту будзе праходзіць пры ўдзеле с.-г. спэцыялістаў.

ПАБУДОВА КАМБІНАТУ Ў М. КАПЫЛІ.

Прэзыдыум АВК лічыць неабходным прыступіць сёлета да пабудовы прамысловага камбінату ў м. Капылі па Случчыне. У склад камбінату ўвойдзе млын з двума паставамі, воўпачоска, крупадзёрка і лазьня.

АСЬЦЯРОГА АД САПУ.

Прэзыдыум акрыканкому абавязаў усіх уласьнікаў коняй мець санітарныя карткі на коняй. У картках будзе адзначана, што конь не хварэе на сап. Пры куплі, прадажы і перадачы коняй у другія рукі карткі павінны пераходзіць разам з коньмі да адпаведных гаспадароў.

Калі конь прыбывае з другіх саюзных рэспублік ці з-замежаў, гаспадар каня павінен у 10-цідзённы тэрмін атрымаць на яго санітарную картку. Сапныя коні забіваюцца, прычым гаспадару выплачваецца кошт іх. Пры невыкананьні гэтага, віноўныя будуць штрафавацца ў суме да 100 руб., а хворыя на сап коні будуць забівацца бяз услякай грашовай узнагароды.

АКРУГОВЫ МАЛОЧНЫ САЮЗ.

У Менску арганізуецца акруговы малочна-жывёлагадоўчы саюз. Мэта арганізацыі саюзу—аб'яднаньне збытавых і даставачных апэрацый нізавой сеткі с.-гаспадарчых таварыстваў Менскай акругі. З дню арганізацыі саюз будзе аднаць 100 розных адзінак акругі.

Для арганізацыі і працы саюзу вызначана 40.000 руб. асноўнага і 73.860 руб. зваротнага капіталу. Арганізацыя саюзу будзе закончана ў другой палове чэрвеня.

ХРОНІКА.

Да 3-га сходу ўпаўнаважаных Белкаапсаюзу.

Сёньня адчыняецца 3-ці сход упаўнаважаных Белкаапсаюзу. Гэты сход падвядзе вынікі двохгадовай дзейнасьці Белкаапсаюзу і ўсей спажывецкай каапэрацыі БССР, а разам з тым вызначыць і шляхі для далейшых перамог на каапэрацыйным фронце.

У апошнія 2 гады быў бурны рост нашай спажывецкай каапэрацыі: колькасьць пайшчыкаў у горадзе ўзрасла з 62.000 чал. на 1-X-25 г. да 121.000 чал. на 1 красавіка бягучага году. Разам з тым узрос процант каапэраваньня сяброў прафсаюзаў з 61,9 да 73 проц. Надзвычайна буйны рост дала нам вясковая спажывецкая каапэрацыя: на 1 кастр. 1925 г. было 192.000 пайшчыкаў, а на 1 красавіка г. г. іх ужо налічваецца 462.000, прычым ахоплена ўжо у сярэднім 51,4 проц. агульнага ліку сялянскіх гаспадарак.

Вырасьлі таксама і паявы капіталы каапэрацыі: у горадзе з 219000 р. да 967000 руб. і на вёсцы з 278.000 руб. да 2.255.000 руб. Агульны зварот спажывецкай каапэрацыі за 1926-27 г. складае досыць буйную суму ў 112.000.000 руб. Каапэрацыйны гандаль за апошнія 2 гады адваяваў некаторыя пазіцыі ў прыватнага гандлю, роля якога з 53,5 проц. зьменшылася да 45,2 проц.

За гэтыя 2 гады колькасьць і роля беднаты ў спажывецкай каапэрацыі значна ўзрасла. За рахунак фонду каапэраваньня беднаты ўцягнуты 88,000 пайшчыкаў; у апошнюю перавыбарную кампанію было праведзена больш 1200 сходаў беднаты. Органы кіраўніцтва і кантролю ў каапэрацыі вызьляюцца бядняцка-серадняцкімі.

У апошнюю справаздачна-перавыбарную кампанію ў сходах прыняло ўдзел 286.000 пайшчыкаў і 98.000 некаапэраванага насельніцтва.

Разам з дасягненьнямі, наша спажывецкая каапэрацыя мае яшчэ і шэраг недахопаў. На тых дасягненьнях, якія мы маем, супакоіцца нельга і сходу ўпаўнаважаных прыдзецца абгаварыць усе гэтыя недахопы і намеціць шляхі для далейшага пашырэньня каапэраваньня насельніцтва, да далейшага палепшэньня абслугоўваньня каапэраванага насельніцтва і да далейшага выцясьненьня прыватніка з рынку. Шмат чаго яшчэ трэба будзе зрабіць для палепшаньня каапэрацыйнай справы ў БССР.

Выплаты выйгрышаў па пазыках.

За апошнія 4 дні Беларуская кантора Дзяржаўнага Банку выплаціла шмат выйгрышаў па пазыцы індустрыялізацыі. Усяго за гэтыя дні Банк выплаціў па гэтай пазыцы 3.000 руб; у ліку аблігацый была прад'яўлена адна на выйгрыш у 1.000 руб. Кантора Белдзяржбанку за апошнія дні выплаціла таксама шэраг выйгрышаў па 48 серыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

3-ці зьезд упаўнаважаных Белкаапсаюзу.

Сёньня адчыняецца 3-ці зьезд упаўнаважаных Белкаапсаюзу. На зьезд чакаецца 250 делегатаў з рашаючым голасам і каля 100 з дарадчым. Напярэдадні зьезду адбыліся ў Белкаапсаюзе нарады жанчын і делегатаў рабочай каапэрацыі. На гэтых нарадах прапрацавана частка пытаньняў, якія будуць разглядацца на зьезьдзе.

На барацьбу з тыфусам.

У апошнія дні значна пашыраецца эпідэмія сыпнога тыфусу ў Воршы і Магілеве. Зарэгістравана таксама 4 выпадкі ў Менску.

Наркамздароўя адпусьціў на барацьбу з тыфусам—Воршы—500 р. і Магілеву—400 р. Разам з тым Наркамздароўя тэрмінова скліча нараду бактэрыёлёгаў і мэдыцынскіх працаўнікоў Менску для выпрацоўкі мер па барацьбе з тыфусам.

У Аўтадоры.

31-га мая адбыўся сход менскага актыву таварыства «Аўтодор», на якім т. т. Іваноў і Нахільніцкі зрабілі даклад аб рабоце Цэнтральнага Таварыства і Акругавога Аддзяленьня Аўтадору.

Па дакладах разгарнуліся шырокія спрэчкі. Усе прамоўцы ўказвалі, што хоць арганізацыя „Аўтодор" утворана яшчэ нядаўна, але ідэя Аўтодору выклікае вялікі інтарэс і дапамогу з боку рабочых і ўсіх працоўных округі.

На цялым шэрагу прадпрыёмстваў і ў установах утвараюцца спэцыяльныя гурткі па вывучэньні аўтатрактарнай і аўтамабільнай справы.

Разам з гэтым прамоўцы скардзіліся, што амаль адсутнічае да гэтага часу ўсялякая літаратура па Аўтадору. З прычыны чаго вельмі цяжка весьці практычныя заняткі гурткоў па вывучэньні аўтамашыны.

Менскі дзень.

22 курортныя месцы адпушчаны сёлета для батракоў БССР на курортах Крыму і Каўказу.

15 месцаў у рабфаках РСФСР адпушчена для БССР. Гэтыя месцы разьмеркаваны паміж ЦК КПСБ і ЦК ЛКСМБ.

У ВУЗЫ РСФСР і УССР для Менскай акругі прадастаўлена 8 месцаў. Заявы будуць прымацца акруговай інспэкцыяй нарасьветы да 12 чэрвеня.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. „Вежа" А. Дудар. Зборнік вершаў, стар. 59, цана 65 кап.
2. «Забаўная хэмія» В. В. Румін, стар. 98, цана 45 кап.
3. „Наўдалы падак» Апавяданьні для дзяцей. Уклажылі Ш. Ліберман і Р. Сіманоўская. Стар. 13, цана 20 кап.
4. „Воўк дурань" Беларуская казка апрацованая Якубам Коласам, малюнкі Міхася Энде, цана 55 кап.
5. „Леў і воўк" мастацкая апрацоўка Якуба Коласа, аўтолітаграфія мастака Г. Змудзінскага, вокладка М. Ізраільскага, цана 50 кап.

„Танныя" абеды.

Беспрацоўныя ў гор. Менску штодня атрымоўваюць 600 абедаў, па 15 кап. абед. Абеды выдаюцца за кошт прафсаюзаў і Біржы Працы.

Трэба сказаць, што ў гэтай сталоўцы няма ніякага парадку, з прычыны чаго беспрацоўныя ня выказваюць асаблівага жаданьня атрымліваць абеды нават за 15 капеек.

Каб палепшыць справу, у сталоўцы былі ўведзены так званыя наглядальнікі за парадкам, але непарадак ад гэтага толькі павялічыўся. Наглядальнікі вельмі груба адносяцца да публікі. Былі нават выпадкі, што беспрацоўныя кідалі свае абеды і ўцякалі з сталоўкі.

Адпаведным органам абед абыходзіцца ня менш як у каапэратыве, а таму, здавалася-б, ён павінен быць ня горшы, чым у сталоўках МЦРК. Чамусьці ў гэтай сталоўцы даюць штодня боршч, ад якога вапітус; другая патрава таксама ня лепшая. Вілкі, нажы даюць рэдка, пра чыстату і гаварыць ня прыходзіцца.

Часта сярод абеду раздаецца крык і шум: гэта нехта нешта знайшоў у боршчы. Загадчык сталоўкі прапануе выліць талерку і даць другую.

Наркампрацы і саюзы павінны прыняць меры да таго, каб у сталоўцы быў наведзен парадак, бо інакш ня варта траціць дарэмна сродкі. **С. Т.**

Папраўка.

У № 128 нашай газэты (за 6 чэрвеня г. г.) у артыкуле „Пленум Цэнтральнага Савету «Проч Нявісьменнасьць» у першым слупку падрукавана:... Калі-ж прыняць пад увагу, што школамі сацвыху штогод ахопліваецца ня больш 16000 дзяцей»... а трэба—«Калі-ж прыняць пад увагу, што школамі сацвыху НЕ АХОПЛІВАЕЦЦА БОЛЬШ 16000 ДЗЯЦЕЙ»...

Працаячэек ТДА-Авіяхіму ўлетку

Лета ставіць перад арганізацыямі ТДА-Авіяхіму цэлы шэраг новых задач. Асноўным у працы гэтай арганізацыі ўлетку зьяўляецца—**шырокае разгортваньне масавай вайсковай працы.** Дзеля таго, каб шырока разгарнуць гэту працу, неабходна прыцягнуць да яе ўдзелу ўсе культурна-асьветныя арганізацыі гораду і вёскі.

ШТО ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ ГУРТКІ ВАЙСКОВЫХ ВЕДАЎ УЛЕТКУ?

Гурткі вайсковых ведаў павінны падагуліць вынікі зімовай працы і распрацаваць пляны на летні час.

Асноўнай задачай у працы гэтых гурткоў улетку зьяўляецца **практычнае замацаваньне набытых зімою тэарэтычных ведаў.**

Для ажыцьцяўленьня гэтага, гурткам трэба будзе рабіць выхады ў поле, тактычныя заняткі, паходы, паказальныя баі і інсцэніроўкі. Падбор кіраўнікоў для вайсковых гурткоў павінен быць асабліва ўважлівым. Для гэтай працы трэба выкарыстаць начсклад запасу, дамабілізаваных чырвонаармейцаў і пераменны склад тэрытарыяльных часьцей. Можна таксама скарыстаць найбольш падрыхтаваных сяброў гурткоў з ліку дапрызыўнікаў.

ПРАЦА СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА.

Улетку арганізацыі ТДА-Авіяхіму павінны разгарнуць масавую вайсковую працу сярод тэй часткі працоўнага насельніцтва, якая ня ўцягнута ў іх арганізацыі.

Асноўнымі задачамі тут зьяўляюцца: шырокая папулярызацыя ідэй ТДА-Авіяхіму сярод працоўных мас, вярбоўка новых сяброў і прыцягненьне іх да практычнай працы ў ячэйках ТДА-Авіяхіму.

Гэта праца павінна быць праведзена шляхам арганізацыі конкурсаў на лепшага стралка, стралковых спаборніцтваў і г. д.

Вясковыя палітасьветныя ўстановы (хаты-чытальні, нарадамы, чырвоныя куткі) у сваёй масавай палітасьветнай працы павінны разгарнуць розныя формы працы для ўкараненьня вайсковых элемэнтаў сярод насельніцтва.

У часы манэўраў—у райёнах, дзе будуць праходзіць вайсковыя часьці, мясцовыя ячэйкі ТДА-Авіяхіму, супольна з вайсковымі арганізацыямі, павінны правесьці належную інфармацыйную працу сярод насельніцтва.

Посьпех летняй працы ТДА-Авіяхіму залежыць толькі ад ініцыятывы і самадзейнасьці саміх сяброў арганізацыі. Толькі вялікая зацікаўленасьць з боку сяброў да працы можа забясьпечыць далейшыя дасягненьні і дасьць яшчэ лепшыя вынікі ў справе ўзмацненьня абароны нашай краіны.

М. А.

Хроніка ТДА-Авіяхіму.

Удзел ТДА-Авіяхіму ў справе камплектаваньня вайсковых школ.

Цэнтральны савет ТДА-Авіяхіму БССР запрапанаваў усім акруговым саветам ТДА-Авіяхіму прыняць самы актыўны ўдзел у кампаніі па вярбоўцы дабраахвотнікаў у вайсковыя школы Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Для гэтага акрсаветам ТДА-Авіяхіму належыць узмацніць папулярызацыю вайсковых школ, а таксама шырэй азнаёміць моладзь аб умовах і парадку прыёму ў вайсковыя школы.

Таксама запрапанавана прыняць удзел у арганізацыі вярбовачныя камісіямі курсаў і груп па падрыхтоўцы для прыёмных іспытаў.

На дапамогу вайсковым гурткам.

Аддзел забясьпечаньня ТДА-Авіяхіму БССР атрымаў з Масквы 90 замежных вінтовак. Апошнія разьмеркаваны паміж акруговымі саветамі ТДА-Авіяхіму.

Апроч таго, атрымана 60 вінтовак фірмы «Тоз», 20 вінтовак № 2 і 100.000 патронаў для дробнакалібравых вінтовак. Атрыманы таксама плякаты для куткоў ТДА Авіяхіму і літаратура па працы ТДА-Авіяхіму.

Падрыхтоўка да правядзеньня другога „Тыдню Абароны".

Цэнтральным Саветам ТДА-Авіяхіму БССР створана камісія для распрацоўкі матар'ялаў на правядзеньне ў БССР кампаніі „Тыдзень Абароны".

Пасьля распрацоўкі гэты матар'ял будзе пасланы ўсім акруговым саветам ТДА-Авіяхіму.

Арганізацыя нядзельніка па абсталяваньні менскага аэрадрому.

10-га чэрвеня, па ініцыятыве Менскага акруговага савету ТДА-Авіяхіму адбудзецца нядзельнік на абсталяваньні менскага аэрадрому.

У нядзельніку ўдзельнічаюць усе сябры ТДА-Авіяхіму і камсамольскія арганізацыі.

Усяго ў нядзельніку будзе ўдзельнічаць каля 900 чал.

СУД.

Рахункавод-растратчык.

Якуб Сьцяпанаў Шагідзевіч працаваў рахункаводам на менскай мытніцы. Пры калектыве служачых, які складаўся з 30 чал., была ўтворана каса ўзаемзданамогі.

Год ад году каса пашыралася, сродкі павялічваліся, кожны супрацоўнік мытніцы меў магчымасьць атрымаць доўгатэрміновую пазыку на палепшаньне свайго быту. У апошні час сродкі касы дасягнулі звыш 1000 р. Апроч таго, пры калектыве была і ячэйка Моп'ру. Скарбнікам і рахункаводам касы ўзаемзданамогі і ячэйкі Моп'ру быў Шагідзевіч.

Ніхто ня мог прадбачыць, што Шагідзевіч, якога лічылі сталым і сумленным чалавекам, зробіцца растратчыкам.

З пачатку Шагідзевіч ускладзеныя на яго абавязкі выконваў добра і сумленна. У лютым г. г. стала вядома, што менская мытніца будзе ліквідавана. Белуча зрабілася на душы ў Шагідзевіча: ні з таго ні з сяго ў галаве яго паўстала думка, што ён астанецца бяз працы, і ён рашыў забясьпечыць сябе на будучыню.

Шагідзевіч распрацаваў плян і пачаў дзейнічаць. Папершае, ён сам сабе даволіў і выпісаў доўгатэрміновы крэдыт у суме 300 р., а далей, пусьціўшыся ў разгул, пачаў запускаць руку ў касу, пагнуў грамадзкія грошы і траціў іх на што толькі залумаецца.

Час ліквідацыі мытніцы набліжаўся. Шагідзевіч лічыў, што растратчыку ліквідацыя на руку. Хто там вельмі будзе правяраць, дабіваецца праўды. Складуць акт, зьвяжуць кніжкі і накіруюць у архіў, а там, як на тым сьвеце, вечная памяць і вечны пакой растраце. Гэтак думаў Шагідзевіч. Аднак, ня так здарылася, як ён думаў. Ліквідацыйная камісія выкрыла, што Шагідзевічам зроблена растрата ў суме 1261 р. 44 к., і ён апынуўся ў папраўчым доме.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Якуба Сьцяпанава Шагідзевіча на два гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на 1 год і 6 месяцаў. Апроч таго, суд прысудзіў з яго ў карысьць касы ўзаемзданамогі 1261 р. 44 к. і наладжаў арышт на маемасьць Шагідзевіча ў забясьпеку іску ячэйкі Моп'ру.

А. Кастроў.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 7-VI 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—57, куп. 4—55.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—06,5, куп. 5—04,5.

Абл. 2 сял. паз.—прад. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—02,5 куп. 5—05.

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—54, куп. 25—44.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 120, куп. 118.

Абл. 12 проц. паз.—прад. 100—25, куп. 100—20.

Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 24—56, куп. 24—46.

ДА ВЕДАМА ЭКСКУРСАНТАЎ

Музэй Рэвалюцыі БССР (Менск) паведамляе, што музэй адчынен ва ўсе дні, акрамя панядзелка і аўторка, з першай гадз. да сямі вечара, а ў нядзелю з 10 гадз. раніцы да 4 гадз. дня.

Пагэтаму просім напраўляць экскурсіі толькі ў вышэйпаказаныя дні, калі музэй адчынен. МУЗЭЙ РЭВАЛЮЦЫІ БССР.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
2-ГІ ЦЫКЛЬ ГАСТРОЛЕЙ
„МЮЗІК-ХОЛЛ".
пры ўдзе е: У. Хенкін, М Юдзіна, трыо Вальдане, Сьнежнай і Брусава. Штодня—2 сэансы.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
„МАСТАК і ЯГО МАДЭЛЬ".
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
з удзелам Панінай, Вольскага і братоў Мілен.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».
АПОШНІЯ 2 СЭРЫІ
„СТЭНЛЕЙ у НЕТРАХ АФРЫКІ.

КІНО «ІКТЭРНАЦЫЯНАЛ».
Новы мастацкі фільм вытворч. Узбекдзяржкіно
„ЧАДРА".
Драма ў 7-х частках.

У дадатак да публікацыі Бельсьцяпрамсаюзу, надрукаванай у № 119-2307 „Сав. Бел." (ад 25 мая г. г.) растлумачваецца, што ў Дашкаўцы і Тошчыцы будзе прадавацца не на 2000 гарадзкіх скрыпачных...

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ

Галоўныя задачы студэнта ў часе вакацый.

Гэтымі днямі канчаецца залікавая сэсія, а з ёю і навучальны год у высшэйшых навучальных установах, рабфаках і тэхнікумах. Значная частка студэнцтва накіруецца ў свае вёскі і мястэчкі. На некалькі месяцаў адзіны вялікі калектыў пралетарскага студэнцтва пакіне муры сваёй навучальнай установы; у гэты час прадстаўнікоў гэтага калектыву—будучых культурных працаўнікоў—нажліва будзе бачыць аваль у кожным райёне. Яны накіраваліся туды, каб адпачыць, каб падпавіць свае сілы.

Але побач з адпачынкам пралетарскі студэнт, прыехаўшы ў вёску, мястэчка, на фабрыку ці завод, ня можа ізаляваць сябе ад грамадзкага жыцьця сваёй мясцовасьці, ад усяго таго, што робіцца вакол яго; абавязак кожнага студэнта—прыняць актыўны ўдзел у грамадзкай працы; да гэтага асабліва прымушае яго недахоп культурных сіл у вёсцы.

Сёлета, калі мы ўступілі ў фазу культурнае рэвалюцыі, гэтая праца будзе мець асаблівае значэньне і трэба, каб кожны студэнт улічваў і памятаў словы Ул. І. Леніна, што «задача ўзьдыму культуры—адна з самых чарговых».

Разумны адпачынак—вось як трэба правесьці летнія вакацыі. Зусім неправільна, калі некаторыя «студэнты» прытрымліваюцца прынцыпу—«адпачываць, дык адпачываць», лічачы, што іх справа выключна спаць, сесьці і гуляць. З гэткімі большасьць студэнцтва не па шляху. Найлепшым адпачынкам пасьля году вучобы будзе практычная праца. Адпачынак трэба будзе праводзіць так, каб кожны свабодны дзень, гадзіну выкарыстаць для ўзмацненьня сувязі з працоўнымі масамі, для ўдзелу ў культурным будаўніцтве вёскі, мястэчка, горада—гэта задача кожнага студэнта.

У мінулыя гады мы мелі шэраг недахопаў у гэтай працы. Галоўнымі з іх зьяўляюцца: адсутнасьць цьвёрдага пляну працы, нерацыянальнае скарыстоўваньне студэнтаў мясцовымі арганізацыямі, недастатковае кіраўніцтва працоўчыкі, непрыстасаваньне форм працы да ўмоў, у якіх яна праводзілася. Сёлета мясцовымі арганізацыямі трэба з самага пачатку разам з студэнцтвам прыняць адпаведныя крокі, каб зьнішчыць гэтыя недахопы і дасягнуць найбольшага эфэкту ад працы. Разам з гэтым студэнту трэба памятаць, што працаваць неабходна выключна пад кіраўніцтвам мясцовых арганізацый, працаваць па іх плянах і ня выдумваючы «новых» пытаньняў. У сваёй працы неабходна прытрымлівацца таго, каб не набіраць сабе шмат абавязкаў: лепей узяць 1-2 і добра іх выконваць, каб дасягнуць пэўных вынікаў.

У летні час, калі ідзе гарачая работа ў вёсцы, форма працы набывае рашучае значэньне. Пры гэткіх умовах лекцыі, даклады не заўсёды даюць належную карысьць; трэба прыстасавацца так, каб у полі ці каля хаты простымі словамі ў гутарцы расказаць і растлумачыць тое ці іншае пытаньне.

Шкода, што некаторыя з сябе робяць універсальнага чалавека: лепш зусім не адказваць на тыя пытаньні, у якіх сам ня ўпэўнен, чым адказаць неправідлова.

Побач з агульнай працай стр... якая будзе праходзіць в пуні... джаньня агульна-палітычных ... пяў, што стаіць на шляху ... чага і культурнага будаўніцтва ... і ў прыватнасьці БССР, асабліва ... студэнта павінен быць у лет... ніках і сьвятах. Дапамога ... ячэйцы ОСО-Авіяхіму, вітр... грамадзкай думкі вакол пытаньня ... ропы краіны—адна з першачар... задач у працы студэнцтва.

У мінулыя гады студэнцтва працавала ў галіне распаўсюджв... хруку; гэты недахоп сёлета трэ... лічыць. Неабходна зьвярнуць ... сыстэматычную пастаноўку пр... распаўсюджваньні газэт, асабліва ... ніцца наладжваньнем падпіскі, ... гаючыся найбольшага ... сельніцтва ў лік падпісчыкаў.

Улетку моладзь рыхтуецца ... ступленьня ў навучальныя ... Тут задачы пралетарызацыі ... шэйшай школы ставяць перад ... студэнтам патрабаваньні—дапа... пралетарскай моладзі ў іх пр... най працы па падрыхтоўцы да ... пленьня ў ВНУ, рабфакі і тэхні...

Абсалютная большасьць студ... лепшая яго частка, як паказ... ных мінулых гадоў, прымае ... гэтай важнай працы. Адзак, ... імі ёсьць, праўда, нязначны ліч... ня прымаюць пілкага ўдзелу ... мадзкай працы. Мясцовае жыц... не датычыцца: яны ніколі не ... пуць у сельсавет, хату-чытальню ... «адпачываюць пасьля цяжкай пр... а іншы раз зьяўляюцца і «студ... гэрої» з належнымі «подвигами», ... бутэлькай у кампаніі гулак, ... і г. д.

Навучальная ўстанова пав... ведаць, што робіць яе студэ... на вакацыях, наколькі яны ... зьяўляюцца праваднікамі куль... най рэвалюцыі. Мы заклікаем ... сцовых працаўнікоў падтрым... ваць па гэтым пытаньні сув... з студэнцкімі арганізацыямі, ... сьвятляць працу студэнцтва ... шым друку, яго дадатныя і ад... ныя бакі і асабліва выводзіць ... паказ савецкай грамадзкасьці ... шкоднікаў, прычым ня толькі ... домых сваім „гэраізмам", ... тых спакойных студэнтаў-аб... таляў, якія кажуць—«моя хата ... краю, ничего не знаю", якія то... «адпачываюць» і ня хочуць д... магчы ў сацыялістычным буд... ніцтве.

У працягу навучальнага году, ... дачы на цяжкія ўмовы, пралетар... студэнцтва праводзіць вялікую ... кую працу; у часе вакацый, ... адпачынку і практыкі лепшая ... студэнцтва яшчэ з большай актыў... цю і энэргіяй прыме ўдзел у гэтай ... лікай, сур'ёзнай і адказнай працы ... падніцьці культурнага ўзроўню ... кіх колаў працоўных і сялянства, ... паможа сваёй вёсцы, мястэчку ... сьці на новы сацыялістычны ... тым самым з посьпехам выканае ... дзены на я